Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

# Музыка

## 1–4 класы

# Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў
агульнай сярэдняй адукацыі

*Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Вучэбнае электроннае выданне

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
Аверсэв
2022

## Прадмова

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па прадмеце «Музыка» для 1—4 класаў складзена ў адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У працэсе навучання настаўнік можа выкарыстоўваць прыкладны музычны матэрыял, прыведзены ў вучэбнай праграме, а таксама музычны матэрыял, самастойна падабраны ў адпаведнасці з задачамі ўрока, узроставымі асаблівасцямі ўспрымання і выканальніцкай дзейнасці навучэнцаў.

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне заклікана аказаць дапамогу настаўніку ў выкладанні вучэбнага прадмета.

Звяртаем увагу на тое, што асноўны вучэбны матэрыял павінен быць засвоены вучнямі на ўроку.

# 1 КЛАС

34 г

Кавалiў, В. В. Музыка : вучэб. дапам. для 1-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : для работы ў кл. / В. В. Кавалiў, М. Б. Гарбунова. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. — 135 с.

| № урока і дата правя-дзення | Тэма ўрока | Коль-касць гадзін | Мэта і задачы ўрока | Асноўныя віды і спосабы дзейнасці | Матэрыял вучэбнага дапамож-ніка |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **I чвэрць<br>Свет гукаў (8 г)** | | | | | |
| 1 | Свет, что гучыць вакол нас | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб гуках навакольнага свету.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з гукавой разнастайнасцю навакольнага свету;<br>2) развіццё ўменняў услухоўвацца ў гукі навакольнага свету і адрозніваць іх;<br>3) фарміраванне ўмення ўзнаўляць гукі | Разважанне над вершам М. Скрабцовай «Повсюду музыки шаги».<br>Правядзенне гульняў «Вызначы, што гучыць», «Люстэрка».<br>Слуханне аўдыязапісаў гукаў навакольнага свету.<br>Узнаўленне гукаў пры дапамозе «малявання» голасам, гучальных жэстаў, гукаперайманне.<br>Развучванне «Песни о звуках» (муз. і сл. Т. Баравік) | С. 4—7 |
| 2 | Прыродныя і механічныя гукі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб прыродных і механічных гуках.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з характэрнымі асаблівасцямі прыродных і меха- | Слуханне аўдыязапісаў прыродных і механічных гукаў і іх класіфікацыя.<br>Разважанне над вершам Э. Нійт «Разные звуки».<br>Правядзенне гульняў «Знайдзі лішняе», «Хто больш?». | С. 8—11 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | нічных гукаў і іх адрозненнем;<br>2) фарміраванне ўменне адрозніваць прыродныя і механічныя гукі;<br>3) фарміраванне ўменне выкарыстоўваць прыродныя і механічныя гукі ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>4) развіццё асацыятыўна-вобразнага мыслення | Выкананне «Песни о звуках» (муз. і сл. Т. Баравік) | |
| 3 | Музыка — краіна гукаў | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб асаблівасцях і выразных магчымасцях музычнага гуку.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з характэрнымі асаблівасцямі музычнага гуку, яго адрозненнем ад прыроднага і механічнага;<br>2) фарміраванне ўменне адрозніваць прыродныя, механічныя і музычныя гукі;<br>3) развіццё навыкаў успрымання і ўзнаўлення музычных гукаў | Развучванне і выкананне на дзіцячых музычных інструментах папеўкі «Андрей-воробей».<br>Слуханне аўдыязапісаў прыродных, механічных і музычных гукаў.<br>Мастацка-творчая работа над вершам Я. Акіма «Родник» з выкарыстаннем рытмадэкламацыі, спеваў, ігры на музычных інструментах.<br>Слуханне п'есы «Птушачка» Э. Грыга.<br>Развучванне песні «Где живет музыка» (муз. і сл. В. Каваліва) | С. 12—15 |
| 4<br>5 | Малюнкі, створаныя пры дапамозе гукаў | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб магчымасцях гукаў у стварэнні музычных малюнкаў.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з выяўленчымі магчымасцямі гукаў;<br>2) фарміраванне ўменне распазна- | Стварэнне гукавога малюнка «Восеньская раніца ў лесе».<br>Правядзенне гульні «Адгадай хто».<br>Выкананне песні «Где живет музыка» (муз. і сл. В. Каваліва).<br>Стварэнне гукавога малюнка «Курыны двор». | С. 16—23 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | ваць выяўленчыя магчымасці гукаў у працэсе ўспрымання і выканання музыкі;<br>3) фарміраванне ўменне ствараць гукавыя малюнкі;<br>4) развіццё асацыятыўна-вобразнага мыслення ў працэсе ўспрымання і ўзнаўлення гукаў | Слуханне музычных твораў «Курыца» Ж.-Ф. Рамо і «Акіян-мора сіняе» М. Рымскага-Корсакава.<br>Развучванне і выкананне песні «Осень» (муз. М. Красева, сл. М. Івенсэн).<br>Стварэнне гукавых малюнкаў на аснове верша М. Скрабцовай «Песня земли» | |
| 6<br>7 | Настрой, перададзены пры дапамозе гукаў | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб магчымасцях гукаў у перадачы настрою.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб разнастайнасці ўнутраных душэўных станаў (настрояў) чалавека;<br>2) фарміраванне ўмення распазнаваць выразныя магчымасці гукаў у працэсе ўспрымання і выканання музыкі;<br>3) стварэнне ўмоў для асэнсавання выразных магчымасцей гукаў у перадачы ўнутранага душэўнага стану чалавека;<br>4) фарміраванне ўмення перадаваць пры дапамозе гукаў настрой; | Выкананне музычнага прывітання з рознай эмацыянальнай афарбоўкай (радасна, сумна, урачыста і да т. п.).<br>Правядзенне гульні «Эмоцыі».<br>Слуханне п'ес «Сумная песенька восеньскага лесу» і «Вясёлы дожджык» Л. Мурашкі.<br>Стварэнне гукавога малюнка на аснове верша М. Скрабцовай «Песня листвы».<br>Прагляд рэпрадукцый на восеньскую тэматыку і іх «агучванне».<br>Развучванне і выкананне песень «Солнышко» і «Дождик» (муз. А. Цілічэевай, сл. Л. Дымавай) | С. 24—31 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 5) выхаванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін да мастацкага вобраза, створанага пры дапамозе гукаў | | |
| 8 | Абагульняючы ўрок па тэме «Свет гукаў» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні аб гуках навакольнага свету.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя і абагульненне ўяўленняў аб свеце гукаў;<br>2) замацаванне ўяўленняў аб ролі гукаў у стварэнні музычных малюнкаў і мастацкіх вобразаў;<br>3) замацаванне навыку выкарыстання прыродных, шумавых і музычных гукаў ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>4) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | Стварэнне гукавых кампазіцый на аснове казак (напрыклад, рускіх казак «Колобок», «Теремок», беларускіх казак «Муха-хахаўка», «Дзедава рукавічка»), апавяданняў, вершаў або карцін.<br>Слуханне і выкананне музычных твораў на выбар настаўніка і навучэнцаў.<br>Правядзенне музычнай віктарыны «Хто як гаворыць?» | С. 32—33 |
| **II чвэрць**<br>**Як расказвае музыка (8 г)** | | | | | |
| 9 | Што і як можна расказаць пры дапамозе гукаў | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб вобразнасці і выразнасці ў музыцы.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб ролі гукаў у стварэнні музычных малюнкаў і мастацкіх вобразаў; | Слуханне музычных твораў «Палёт чмяля» М. Рымскага-Корсакава, «Сумная песенька восеньскага лесу» і «Вясёлы дожджык» Л. Мурашкі, п’есы «Вясёлы селянін, які вяртаецца з працы» Р. Шумана.<br>Развучванне і выкананне «Песенкі | С. 34—37 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2) увядзенне паняццяў *вобразнасць* і *выразнасць*;<br>3) развіццё ўмення дыферэнцыраваць выяўленчыя і выразныя магчымасці музыкі | друзей» (муз. В. Герчык, сл. Я. Акіма) з суправаджэннем на дзіцячых музычных інструментах | |
| 10 | Гукаперайманне | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб гукаперайманні як імітацыі гучання навакольнага свету.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя існуючага вопыту гукапераймання;<br>2) азнаямленне з выяўленчымі і выразнымі магчымасцямі гукаперамання;<br>3) фарміраванне ўмення выкарыстоўваць прыёмы гукаперайманння ў працэсе ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>4) развіццё асацыятыўна-вобразнага мыслення, фантазіі і ўяўлення | Развучванне і выкананне папеўкі-прывітання «Хей-хей, привет тебе!».<br>Правядзенне гульняў «Адгадай хто» і «Хто як голас падае».<br>Развучванне песні «По грибы» (муз. У. Алоўнікава, сл. М. Алтухова).<br>Слуханне п’есы «Куры і пеўні» К. Сен-Санса.<br>Стварэнне гукавога малюнка на аснове верша М. Някрасава «Перед дождем» | С. 38—41 |
| 11 | Святло і цень у музыцы (лад) | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб ладзе як святле і цені ў музыцы.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з рознымі спалучэннямі гукаў і сугучнасцей, якія перадаюць святло і цень у музыцы; | Выкананне музычнага прывітання ў двух варыянтах (у мажоры і мінорь).<br>Выкананне песні «По грибы» (муз. У. Алоўнікава, сл. М. Алтухова).<br>Слуханне п’есы «Клоўны» Д. Кабалеўскага. | С. 42—45 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2) фарміраванне першапачатковага ўмення распазнаваць святло і цень (лад) у музыцы;<br>3) стварэнне ўмоў для асэнсавання выяўленчых магчымасцей святла і ценю (ладу) у музыцы;<br>4) развіццё ладавага пачуцця | Аналіз і «агучванне» вершаў «Адлёт жураўлёў» Я. Коласа, «Восень» І. Багдановіч.<br>Развучванне песні «Пайшоў коўзацца каток» (муз. нар., сл. С. Шушкевіча) з выкарыстаннем музычна-рытмічных рухаў і інсцэніроўкі | |
| 12 | Хуткае і павольнае ў музыцы (тэмп) | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб тэмпе як хуткасці выканання гукаў.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб хуткім і павольным выкананні гукаў;<br>2) фарміраванне першапачатковага ўмення распазнаваць хуткае і павольнае (тэмп) у музыцы;<br>3) асэнсаванне выразных магчымасцей хуткага і павольнага выканання гукаў у музыцы;<br>4) фарміраванне ўмення выкарыстоўваць хуткае і павольнае гучанне ў працэсе ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>5) развіццё ўяўлення, фантазіі | Выкананне музычнага прывітання ў розных тэмпах: павольным і хуткім.<br>Слуханне п’ес «Антылопы» і «Чарапаха» К. Сен-Санса з выкарыстаннем пластычнай імправізацыі.<br>Дэкламацыя з рознай хуткасцю вымаўлення вершаў «Снегири» А. Пракоф’ева і «Пришла зима» І. Чарніцкай.<br>Развучванне песні «Добрый жук» (муз. А. Спадавекіа, сл. Я. Шварца) | С. 46—49 |
| 13 | Гучнае і ціхае ў музыцы (дынаміка) | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб дынаміцы як гучнасці гуку. | Выкананне музычнага прывітання ў розных варыянтах (гучна і ціха, узмацняючы і аслабляючы гучанне). | С. 50—53 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | *Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб гучным і ціхім гучанні музыкі;<br>2) фарміраванне першапачатковага ўмення распазнаваць гучнае і ціхае гучанне ў музыцы;<br>3) стварэнне ўмоў для асэнсавання выразных магчымасцей ступені гучнасці гучання;<br>4) фарміраванне ўмення выкарыстоўваць гучнае і ціхае гучанне ў працэсе ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>5) развіццё дынамічнага слыху | Слуханне п'есы «Сані са званочкамі» У. Агафоннікава з выкарыстаннем пластычнага інтанавання.<br>Дэкламацыя верша В. Каваліва «Ветерок».<br>Выкананне песні «Добрый жук» (муз. А. Спадавекіа, сл. Я. Шварца) з выкарыстаннем музычна-рытмічных рухаў і ігры на музычных інструментах | |
| 14 | Халодная і цёплая музыка (тэмбр) | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб тэмбры як афарбоўцы гуку.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб разнастайнасці музычных фарбаў (тэмбраў);<br>2) фарміраванне першапачатковага ўмення распазнаваць афарбоўку гуку ў музыцы;<br>3) фарміраванне ўмення выкарыстоўваць музычныя фарбы (тэмбры) у працэсе ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>4) стварэнне ўмоў для асэнсавання выразных магчымасцей халодных і цёплых фарбаў музыкі;<br>5) развіццё тэмбравага слыху | Выкананне музычнага прывітання з выкарыстаннем розных інструментаў.<br>Правядзенне гульні «Адгадай, чый голас».<br>Развучванне і выкананне песні-гульні «Догадайся, кто поет» (муз. А. Цілічэевай, сл. А. Гангава).<br>Слуханне «Вальса снежных камякоў» П. Чайкоўскага.<br>Развучванне песні «Здравствуй, зимушка-зима» (муз. А. Філіпенкі, сл. Т. Волгінай).<br>Агучванне верша А. Благінінай «Зима» з выкарыстаннем музычных інструментаў | С. 54—57 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 15 | Высокія і нізкія гукі (рэгістр) | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб рэгістры як вышыні гуку.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з высокімі і нізкімі гукамі;<br>2) фарміраванне ўмення распазнаваць высокія і нізкія гукі;<br>3) фарміраванне ўмення выкарыстоўваць высокія і нізкія гукі ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>4) стварэнне ўмоў для асэнсавання выразных магчымасцей высокіх і нізкіх гукаў | Выкананне музычнага прывітання з выкарыстаннем высокіх і нізкіх гукаў.<br>Развучванне папеўкі «Бубенчики» (муз. А. Цілічэевай, сл. М. Долінава).<br>Выкананне песні «Здравствуй, зимушка-зима» (муз. А. Філіпенкі, сл. Т. Волгінай) з выкарыстаннем музычна-рытмічных рухаў.<br>Слуханне п’есы Р. Шумана «Дзед Мароз» з выкарыстаннем пластычнага інтанавання.<br>Развучванне песні «Новогодняя» (муз. В. Каваліва, сл. А. Навуменкі) | С. 58—61 |
| 16 | Абагульняючы ўрок па тэме «Як расказвае музыка» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні аб выяўленчых і выразных магчымасцях музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя і абагульненне ўяўленняў аб выяўленчых і выразных магчымасцях музыкі;<br>2) замацаванне навыкаў выкарыстання выяўленчых і выразных магчымасцей музыкі ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>3) удасканальванне слухацкіх і выканальніцкіх уменняў | Выкананне песень «Новогодняя» (муз. В. Каваліва, сл. А. Навуменкі) і «Здравствуй, зимушка-зима» (муз. А. Філіпенкі, сл. Т. Волгінай) з выкарыстаннем музычна-рытмічных рухаў.<br>Слуханне п’есы «Гульня ў снежкі» К. Цесакова.<br>Слуханне і выкананне музычных твораў на выбар настаўніка і навучэнцаў | С. 62—65 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | **III чвэрць**<br>**З чаго вырасла музыка (9 г)** | | |
| 17 | З чаго пачынаецца музыка | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб мастацкім вобразе ў музыцы.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб выяўленчых і выразных магчымасцях музыкі;<br>2) удасканальванне ўмення вызначаць настрой і вобраз у музыцы;<br>3) фарміраванне ўмення выкарыстоўваць выяўленчыя і выразныя магчымасці музыкі ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>4) развіццё слухацкай культуры | Слуханне п’ес «Акварыум» і «Зязюля ў глыбіні лесу» К. Сен-Санса.<br>Стварэнне гукавой кампазіцыі на верш А. Пушкіна «Зимний вечер» з выкарыстаннем пластычнага інтанавання, мімічных карцінак і музычных інструментаў.<br>Развучванне «Песенки о гномиках» (муз. і сл. В. Каваліва).<br>Слуханне п’ес «Ранак у лесе» і «Вечар» В. Салманава | С. 66—69 |
| 18 | Песня, танец, марш | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб жанрах песні, танца, марша.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя слухацкага вопыту з мэтай вызначэння жанравай разнастайнасці музыкі;<br>2) азнаямленне з «першаснымі» жанрамі ў музыцы — песняй, танцам і маршам;<br>3) фарміраванне ўмення распазнаваць песню, танец і марш;<br>4) развіццё слухацкай культуры | Развучванне папеўкі «В нашем классе» Д. Кабалеўскага.<br>Слуханне «Марша» С. Пракоф’ева, «Італьянскай полькі» С. Рахманінава.<br>Развучванне песні «Весёлый музыкант» (муз. А. Філіпенкі, сл. Т. Волгінай).<br>Выкананне «Песенки о гномиках» (муз. і сл. В. Каваліва) з выкарыстаннем элементаў тэатралізацыі | С. 70—73 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 19 | Жывы пульс музыкі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб метры (пульсацыі) і яго ролі ў музыцы.<br>*Задачы*:<br>1) увядзенне паняццяў *пульсацыя*, *моцная* і *слабая долі*;<br>2) навучанне ўзнаўленню раўнамернай пульсацыі;<br>3) фарміраванне ўмення ствараць рытмічны акампанемент да знаёмай мелодыі на аснове моцнай і слабай долі;<br>4) развіццё пачуцця рытму | Узнаўленне двухдольнай і трохдольнай пульсацыі пры дапамозе гучальных жэстаў, двухскладовых і трохскладовых слоў.<br>Дэкламацыя верша Л. Шакуціна «Я причесан и помыт» з выкарыстаннем раўнамернай пульсацыі.<br>Стварэнне рытмічнага акампанементу да «Марша» В. Кузняцова і песні «Барабан» (муз. Л. Сімаковіч, сл. Б. Жанчака).<br>Выкананне песні «Весёлый музыкант» (муз. А. Філіпенкі, сл. Т. Волгінай) з выкарыстаннем рытмічнага акампанементу і інсцэніроўкі | С. 74—77 |
| 20 | Якія бываюць маршы | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб відавой разнастайнасці маршаў.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб жанры марша;<br>2) азнаямленне з відамі марша;<br>3) фарміраванне ўмення адрозніваць розныя віды марша;<br>4) фарміраванне ўмення мадэляваць рытмічны малюнак марша ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>5) развіццё пачуцця рытму | Слуханне марша з оперы «Аіда» Дж. Вердзі, «Сустрэчнага марша» С. Чарнецкага, «Футбольнага марша» М. Блантэра, «Марша драўляных салдацікаў» П. Чайкоўскага з выкарыстаннем музычна-рытмічных рухаў.<br>Слуханне «Песни юных защитников Отечества».<br>Развучванне песні «Бравые солдаты» (муз. А. Філіпенкі, сл. Т. Волгінай) | С. 78—81 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 21<br>22 | Якія бываюць танцы | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб відавой разнастайнасці танцаў.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб жанры танца;<br>2) азнаямленне з танцамі *полька*, *вальс*;<br>3) фарміраванне ўмення адрозніваць розныя віды танца;<br>4) фарміраванне ўмення ўзнаўляць танцавальныя рухі ў працэсе слухання музыкі;<br>5) развіццё слухацкай культуры | Слуханне (на выбар настаўніка) «Менуэта» Л. Бакерыні, «Гапака» М. Мусаргскага, «Танца маладога бегемота» Д. Кабалеўскага, «Вальса кошкі» У. Залатарова, «Полькі» М. Глінкі, «Полькі» П. Чайкоўскага, «Вальса на балі» С. Баневіча, «Вальса сланоў» К. Сен-Санса з выкарыстаннем танцавальных рухаў.<br>Развучванне і выкананне песні «Начинаем перепляс» (муз. С. Сасніна, сл. П. Сіняўскага) з выкарыстаннем танцавальных рухаў | С. 82—89 |
| 23 | Песня ў жыцці чалавека | 1 | *Мэта*: паглыбіць уяўленні аб жанры песні.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб жанры песні;<br>2) стварэнне ўмоў для асэнсавання змястоўных і выразных магчымасцей песні;<br>3) фарміраванне ўмення выразна выконваць песню;<br>4) фарміраванне ўмення ствараць меладычны і рытмічны малюнак да вершаў;<br>5) развіццё выканальніцкай культуры | Слуханне казкі В. Каваліва «Откуда появилась песня».<br>Развучванне «Калыханкі» (муз. В. Раінчыка, сл. Г. Бураўкіна).<br>Слуханне «Калыханкі маці» (муз. Л. Шлег) з выкарыстаннем пластычнага інтанавання | С. 90—93 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 24 | Песня, танец, марш сустракаюцца ў адным музычным творы | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб магчымасцях выкарыстання жанраў песні, танца і марша ў адным музычным творы.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб жанрах песні, танца, марша;<br>2) азнаямленне з жанрамі *песня-танец* і *песня-марш*;<br>3) удасканальванне ўмення вызначаць на слых жанры, якія сустракаюцца ў адным творы;<br>4) фарміраванне ўмення мадэляваць меладычны і рытмічны малюнак песень-танцаў і песень-маршаў;<br>5) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | Выкананне папеўкі «В нашем классе» Д. Кабалеўскага.<br>Развучванне песні ў жанры *песня-танец* (або *песня-марш*) з выкарыстаннем пластычнага інтанавання.<br>Слуханне і выкананне песень «Весёлый музыкант» (муз. А. Філіпенкі, сл. Т. Волгінай), «Бравые солдаты» (муз. А. Філіпенкі, сл. Т. Волгінай), «Начинаем перепляс» (муз. С. Сасніна, сл. П. Сіняўскага) з выкарыстаннем музычна-рытмічных і танцавальных рухаў | С. 94—97 |
| 25 | Абагульняючы ўрок па тэме «З чаго вырасла музыка» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні аб жанрах песні, танца, марша і іх разнавіднасцях.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя і абагульненне ўяўленняў аб першасных жанрах;<br>2) удасканальванне ўмення адрозніваць першасныя жанры;<br>3) удасканальванне слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>4) развіццё творчага мыслення | Слуханне «Полькі» С. Рахманінава, «Вальса-жарту» Д. Шастаковіча, «Трох варыянтаў марша» Д. Кабалеўскага, п'есы «Таўстун, які танцуе» Г. Гарэлавай.<br>Слуханне і выкананне музычных твораў розных жанраў на выбар настаўніка і навучэнцаў | С. 98—99 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | **IV чвэрць**<br>**Пра што расказвае музыка (9 г)** | | |
| 26 | Музычныя гісторыі, расказаныя кампазітарамі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб музыцы як з'яве, здольнай «расказваць» гісторыі.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з музычнымі гісторыямі, у якіх праяўляюцца выяўленча-выразныя магчымасці музыкі;<br>2) фарміраванне ўмення знаходзіць узаемасувязь зместу музычнага твора з выяўленча-выразнымі асаблівасцямі музыкі;<br>3) удасканальванне ўмення вызначаць выразнасць і вобразнасць у музыцы;<br>4) развіццё слухацкай культуры, асацыятыўна-вобразнага мыслення | Слуханне п'ес «Гульня ручайка» Л. Мурашкі, «Песня жаваранка» П. Чайкоўскага.<br>Развучванне нямецкай народнай песні «Вясна» | С. 100—103 |
| 27<br>28 | Музыка перадае пачуцці чалавека | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб ролі музыкі ў перадачы пачуццяў чалавека.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб выразных магчымасцях музыкі;<br>2) азнаямленне з творамі, у якіх музыка перадае пачуцці чалавека (смутак, радасць); | Слуханне п'ес «Хвароба лялькі» і «Новая лялька» П. Чайкоўскага, «Весела» і «Сумна» Я. Хансена, «Сумная мелодыя» А. Гнесінай і «Сумная гісторыя» Д. Кабалеўскага.<br>Развучванне «Бесконечной песенки» (муз. В. Каваліва, сл. В. Семерніна).<br>Агучванне вершаваных тэкстаў з выкарыстаннем гукаперайманняў, ігры | С. 104—111 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 3) фарміраванне ўмення вызначаць перададзеныя ў музыцы пачуцці;<br>4) развіццё ўмення перадаваць пачуцці ва ўласнай мастацкай дзейнасці сродкамі пластычнай імправізацыі;<br>5) фарміраванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін да перададзенага ў музыцы мастацкага вобраза | на музычных інструментах.<br>Выкананне нямецкай народнай песні «Вясна» | |
| 29 | Музыка адлюстроўвае розныя рысы характару | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб ролі музыкі ў перадачы розных рыс характару чалавека.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб выяўленча-выразных магчымасцях музыкі;<br>2) азнаямленне з творамі, у якіх адлюстроўваюцца розныя рысы характару чалавека;<br>3) навучанне мадэляванню розных рыс характару ў працэсе элементарнага музіцыравання;<br>4) развіццё асацыятыўна-вобразнага мыслення | Развучванне папеўкі «Разные ребята» Д. Кабалеўскага.<br>Слуханне п'есы «Смелы яздок» Р. Шумана.<br>Развучванне песні «Ягорачка» (муз. В. Сярых, сл. народныя) з выкарыстаннем ігры на музычных інструментах.<br>Састаўленне гукавых партрэтаў казачных персанажаў.<br>Слуханне п'ес «Упарты» Г. Свірыдава, «Капрызуля» Я. Глебава | С. 112—115 |
| 30 | Музыка перадае рух | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб ролі музыкі ў перадачы руху.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб выяўленчых магчымасцях музыкі; | Мадэляванне рухаў дарослых і дзяцей пры дапамозе гучальных жэстаў.<br>Пластычная імправізацыя на вершы В. Каваліва «Медленно», «Быстро», «Быстро и коротко». | С. 116—119 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2) азнаямленне з музычнымі творамі, у якіх перададзены рух;<br>3) мадэляванне разнастайных рухаў сродкамі пластычнай імправізацыі;<br>4) развіццё пачуцця рытму, асацыятыўна-вобразнага мыслення | Слуханне (на выбар настаўніка) п'ес «Чарапаха» К. Сен-Санса, «Мядзведзь» В. Рэбікава, «Ваўчок» Ж. Бізэ, «Цягнік» М. Старакадамскага, «У госці» («Пехатой», «На веласіпедзе», «На машыне») І. Арсеева.<br>Рухавая гульня «Мішка» (паводле І. Сафаравай).<br>Развучванне песні «Волчок» (муз. І. Арсеева, сл. Л. Дымавай) | |
| 31<br>32 | Музыка малюе карціны | 2 | *Мэта*: паглыбіць уяўленні аб выяўленчых магчымасцях музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з музычнымі творамі, у якіх перададзены вобраз прыроды;<br>2) фарміраванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін да мастацкага вобраза, які перададзены ў творы;<br>3) мадэляванне музычных малюнкаў сродкамі інструментальнай і пластычнай імправізацыі;<br>4) развіццё асацыятыўна-вобразнага мыслення | Слуханне п'ес «Матылёк» Э. Грыга, «Музычная табакерка» А. Лядава з выкарыстаннем пластычнага інтанавання.<br>Развучванне і выкананне песень (на выбар настаўніка) у суправаджэнні ігры на музычных інструментах.<br>Выкананне песні «Волчок» (муз. І. Арсеева, сл. Л. Дымавай) | С. 120—127 |
| 33 | Музыка народнага свята | 1 | *Мэта*: сфарміраваць агульнае ўяўленне аб ролі музыкі ў народным свяце. | Развучванне, выкананне і інсцэніраванне беларускай народнай песні «Іграў я на дудцы». | С. 128—131 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | *Задачы*:<br>1) азнаямленне з музычным рэпертуарам народнага свята;<br>2) фарміраванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін да народнай творчасці;<br>3) фарміраванне ўмення інсцэніраваць элементы народнага свята;<br>4) развіццё слухацкай культуры | Інсцэніраванне беларускага народнага свята «Юр'еў дзень» з выкарыстаннем музычных інструментаў, музычна-рытмічных і танцавальных рухаў.<br>Правядзенне гульні «Пастух і авечкі» | |
| 34 | Абагульняючы ўрок па тэме «Пра што расказвае музыка» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленне аб музыцы як з'яве, здольнай «расказваць» гісторыі.<br>*Задачы*:<br>1) абагульненне і сістэматызацыя ўяўленняў аб выяўленча-выразных магчымасцях музыкі;<br>2) удасканальванне ўмення распазнаваць выразна-выяўленчыя магчымасці музыкі;<br>3) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | Выкананне песень «Где живет музыка» (муз. і сл. В. Каваліва), «В нашем классе» (муз. і сл. Д. Кабалеўскага).<br>Дэкламацыя верша В. Семерніна «Что такое звуки?».<br>Слуханне і выкананне музычных твораў на выбар настаўніка і навучэнцаў | С. 132—133 |

# 2 КЛАС

34 г

Кавалiў, В. В. Музыка : вучэб. дапам. для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : для работы ў кл. / В. В. Кавалiў, М. Б. Гарбунова. — Мінск : Пачатковая школа, 2019. — 152 с.

| № урока і дата правядзення | Тэма ўрока | Колькасць гадзін | Мэта і задачы ўрока | Асноўныя віды і спосабы дзейнасці | Матэрыял вучэбнага дапаможніка |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **I паўгоддзе<br>Сродкі музычнай выразнасці (16 г)** | | | | | |
| 1 | Як кампазітары, выканаўцы і слухачы разумеюць адзін аднаго | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб тым, як кампазітар, выканаўца і слухач разумеюць адзін аднаго.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб ролі і значэнні выразных і выяўленчых магчымасцей музычнай мовы;<br>2) увядзенне паняццяў *кампазітар*, *выканаўца*, *слухач*;<br>3) навучанне самастойнаму мадэляванню мастацкага вобраза ў працэсе спеваў, інструментальнага музіцыравання, пластычнага інтанавання; | Знаёмства з паняццямі *кампазітар*, *выканаўца*, *слухач*; абмеркаванне пытанняў: «Як выканаўца разумее кампазітара?», «Як слухач разумее выканаўцу?».<br>Слуханне і параўнальны аналіз твораў «Сумны сабака», «Крот-працаўнік», «У кузні», «Вятрак» А. Безенсон.<br>Слуханне песні «Явар і каліна» (муз. Ю. Семянякі, сл. Я. Купалы).<br>Колеравае мадэляванне ўласнага настрою, які ўзнікае ў працэсе праслухвання песні «Явар і каліна».<br>Развучванне песні «Гусанькі» (муз. В. Каваліва, сл. С. Шушкевіча) | С. 4—7 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 4) удасканальванне ўмення вызначаць эмацыянальна-вобразны змест музычнага твора па асаблівасцях музычнай мовы | | |
| 2<br>3 | Мелодыя — каралева музыкі | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб мелодыі як аб «душы музычнага твора» (Д. Шастаковіч).<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб ролі і значэнні выразных і выяўленчых магчымасцей музыкі;<br>2) асэнсаванне выразных магчымасцей мелодыі;<br>3) фарміраванне першапачатковага ўяўлення аб нотах і натацыі;<br>4) развіццё ўмення ствараць мелодыі голасам і на музычных інструментах;<br>5) развіццё меладычнага слыху | Правядзенне гульні-размінкі «Адгадай мелодыю».<br>Агучванне голасам і на гукавышынных музычных інструментах графічных запісаў мелодыі.<br>Пластычнае мадэляванне простых мелодый, мелодый вакальна-харавых практыкаванняў для распявання.<br>Колеравае мадэляванне настрою «Мелодыі» Я. Глебава.<br>Развучванне песні «Карункі асеннія» (муз. і сл. Я. Жабко); выкананне песні з музычным акампанементам.<br>Вакальнае выкананне гукарада *до*, *рэ*, *мі*, *фа*, *соль*, *ля*, *сі* ўверх і ўніз (з прымяненнем прыёму пластычнага інтанавання).<br>Выкананне гукарада *до*, *рэ*, *мі*, *фа*, *соль*, *ля*, *сі* ўверх і ўніз на гукавышынных інструментах (ксілафоне, металафоне) або імітацыя выканання гукарада на клавіятуры фартэпіяна.<br>Знаёмства з паняццямі *ноты*, *нотны стан*, *скрыпічны ключ*; запіс нот на асноўных рабочых лінейках нотнага стану і паміж лінейкамі. | С. 8—15 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Развучванне песні «До, ре, ми, фа, соль» (муз. А. Астроўскага, сл. З. Пятрова).<br>Вакальная імправізацыя (на аснове прапанаваных малюнкаў і вершаваных тэкстаў).<br>Параўнанне гучання мелодыі песні з акампанементам і без акампанементу.<br>Слуханне і параўнальны аналіз «Вальса» Я. Догі ў выкананні флейты (сола) і сімфанічнага аркестра | |
| 4<br>5 | Рытм — залаты ключык музыкі | 2 | *Мэта*: сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб рытме і сістэме працягласцей.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб пульсацыі, моцнай і слабай долях;<br>2) увядзенне паняццяў *метр*, *рытм*, *працягласць*, *паўза*, *рытмічны малюнак*;<br>3) азнаямленне з сістэмай рытмаскладоў;<br>4) навучанне мадэляванню і ўзнаўленню рытмічнага малюнка;<br>5) развіццё пачуцця рытму | Знаёмства з паняццямі *метр*, *рытм*, *працягласць*, *паўза*, *рытмічны малюнак*.<br>Рытмадэкламацыя тэкстаў вядомых дзіцячых чатырохрадкоўяў.<br>Работа з рытмаскладамі; запіс нот (палавіннымі, чацвяртнымі і васьмымі працягласцямі).<br>Слуханне і выкананне беларускага народнага танца «Бульба» і п'есы «На арэлях» Ф. Рыбіцкага з выкарыстаннем гучальных жэстаў і ігры на музычных інструментах.<br>Развучванне эстонскай народнай песні «Взял волынку наш сосед»; выкананне песні з элементамі тэатралізацыі і музычным акампанементам на дзіцячых ударных інструментах. | С. 16—23 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Чытанне і выкананне метрычных схем і рытмічных малюнкаў з выкарыстаннем гучальных жэстаў.<br>Выкананне рытму знаёмых мелодый пры дапамозе воплескаў.<br>Слуханне і параўнальны аналіз народных танцаў «Лявоніха» (беларускі), «Лезгінка» (каўказскі), рускай народнай песні «Во поле берёза стояла» і «Вальса снежных камякоў» П. Чайкоўскага.<br>Выкананне рускай народнай песні «Во поле берёза стояла» з рытмічным акампанементам.<br>Развучванне і аналіз папеўкі «Крокодил и Чебурашка» (муз. і сл. І. Арсеева) з праплясканнем (адстукваннем) рытмічнага малюнка мелодыі | |
| 6<br>7 | Тэмп у жыцці і ў музыцы | 2 | *Мэта*: сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб тэмпе і яго ролі ў стварэнні мастацкага вобраза.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб хуткім і павольным руху ў жыцці і ў музыцы;<br>2) увядзенне паняцця *тэмп*;<br>3) выяўленне выразных і выяўленчых магчымасцей тэмпу | Гутарка пра хуткасць руху розных аб'ектаў жывой і нежывой прыроды, хуткасць работы розных механічных устройстваў.<br>Знаёмства з паняццем *тэмп*. Мадэляванне мастацкага вобраза пры дапамозе пластычных рухаў і на музычных інструментах (перадача руху чалавека, слімака, ляніўца, сараканожкі, аленя і інш.). | С. 24—33 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | ў музыцы;<br>4) фарміраванне ўмення змяняць тэмп у працэсе спеваў, інструментальнага музіцыравання, пластычнага інтанавання ў залежнасці ад зместу твора;<br>5) фарміраванне ўмення самастойна мадэляваць мастацкі вобраз, выкарыстоўваючы выразныя магчымасці тэмпу | Знаёмства з паняццем тэмпу ў музыцы і яго разнавіднасцямі; абазначэнне тэмпу ў нотах.<br>Праслухоўванне і параўнальны аналіз п'ес «Драўляны конік» Б. Дварыёнаса і «Каралеўскі марш ільвоў» К. Сен-Санса.<br>Адлюстраванне на ксілафоне скачкоў каня і хады львоў (перадача спакойнага, жвавага і хуткага руху).<br>Развучванне і выразнае выкананне песні «Карусель» (муз. Д. Кабалеўскага, сл. І. Рахілы) з выкарыстаннем гучальных жэстаў.<br>Праслухоўванне і аналіз «Попутной песни» (муз. М. Глінкі, сл. Н. Кукальніка).<br>Работа над скорагаворкамі; выкананне вакальна-харавых практыкаванняў у розным тэмпе, адпрацоўка дыкцыі.<br>Праслухоўванне і параўнальны аналіз п'ес «Кастрычнік. Восеньская песня» і «Лістапад. На тройцы» П. Чайкоўскага з цыкла «Поры года».<br>Праслухоўванне і аналіз «Венгерскага танца» І. Брамса.<br>Стварэнне музычнага акампанементу да вершаў.<br>Развучванне песні «Веселые путеше- | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | ственники» (муз. М. Старакадамскага, сл. С. Міхалкова).<br>Развучванне рытмічнага суправаджэння да песні «Веселые путешественники»; выкананне песні з інструментальным суправаджэннем.<br>Пісьмовая работа па асваенні нотнай граматы (разгадванне і самастойнае састаўленне музычных рэбусаў) | |
| 8<br>9 | Лад — згода, парадак паміж гукамі | 2 | *Мэта*: сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб ладзе і яго ролі ў стварэнні мастацкага вобраза.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб святле і цені ў музыцы;<br>2) увядзенне паняццяў *лад*, *мажор*, *мінор*, *тоніка*;<br>3) выяўленне выразных магчымасцей ладу ў музычным творы;<br>4) фарміраванне ўмення выкарыстоўваць магчымасці ладу ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>5) развіццё ўмення прасочваць ладавыя змены ў музычным творы | Знаёмства з паняццямі *лад*, *мажор*, *мінор*, *тоніка*.<br>Слуханне і параўнальны аналіз твораў «Ранак у лесе», «Вечар» В. Салманава.<br>Слуханне песні «Мама моя милая» (муз. В. Каваліва, сл. С. Сардэчнай); параўнанне настрою ў запеве і прыпеве.<br>Развучванне і выкананне беларускай народнай песні «Ляцелі гусёлкі» з рытмічным акампанементам.<br>Развучванне і выкананне беларускай народнай песні «Саўка ды Грышка».<br>Інсцэніраванне беларускай народнай песні «Саўка ды Грышка».<br>Праслухоўванне п’есы «Вясёлая і сумная» Л. Бетховена; стварэнне гісторыі (літаратурнага тэксту) да п’есы. | С. 34—41 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Развучванне беларускай народнай песні «Перапёлачка».<br>Развучванне інструментальнага суправаджэння да песні «Перапёлачка»; выкананне песні з інструментальным суправаджэннем.<br>Развучванне песні «Белочки» (муз. З. Левінай, сл. Л. Някрасавай). Колеравае мадэляванне настрою песні «Белочки»; абмеркаванне выканальніцкага плана песні і выкананне яе па ролях.<br>Пісьмовая работа па асваенні нотнай граматы (запіс нот на нотным стане; запіс простых працягласцей) | |
| 10<br>11 | Сіла гуку (дынамічныя адценні) | 2 | *Мэта*: сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб дынаміцы і яе ролі ў стварэнні мастацкага вобраза.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб «блізкім» і «далёкім» у музыцы;<br>2) увядзенне паняцця *дынаміка*;<br>3) знаёмства з дынамічнымі адценнямі;<br>4) выяўленне выразных і выяўленчых магчымасцей дынамікі ў музыцы; | Правядзенне гульняў «Рытмічнае рэха», «Музычнае рэха».<br>Чытанне вершаў: «Бура» Д. Хармса і «Вечар» Ф. Цютчава са змяненнем гучнасці голасу ў залежнасці ад зместу твора.<br>Знаёмства з паняццем *дынаміка*, назвамі і абазначэннямі асноўных дынамічных адценняў (*піянісіма*, *піяна*, *меццa-піяна*, *мецца-фортэ*, *фортэ*, *фартысіма*).<br>Работа з рытмаскладамі: выкананне рытмічных малюнкаў з рознай дынамікай. | С. 42—49 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 5) фарміраванне ўменняў назіраць за зменай дынамічных адценняў і самастойна прымяняць іх ва ўласнай мастацкай дзейнасці | Развучванне папевак з дынамічнымі адценнямі, якія змяняюцца: «Игра в слова» (муз. Д. Кабалеўскага, сл. А. Барто), «Музычнае рэха» (муз. і сл. М. Андрэевай), «Ціха-гучна» (муз. і сл. І. Арсеева).<br>Праслухоўванне твора «Рэха ў гарах» С. Майкапара.<br>Колеравае і пластычнае мадэляванне гучных і ціхіх гукаў.<br>Праслухоўванне твора «У пячоры горнага караля» Э. Грыга; суправаджэнне слухання рытмічным акампанементам.<br>Праслухоўванне песні «Полюшко» (муз. Л. Кніпера, сл. В. Гусева); суправаджэнне слухання пластычнымі рухамі.<br>Адлюстраванне тэмпавых змен музыкі пры дапамозе выразных рухаў.<br>Развучванне песні «Начавала ночка» (муз. В. Каваліва, сл. У. Мазго).<br>Пісьмовая работа па асваенні нотнай граматы (запіс найпрасцейшых рытмаформул, запіс нот на нотным стане) | |
| 12<br>13 | Рэгістр — краіна гукаў: высокіх, сярэдніх і нізкіх | 2 | *Мэта*: сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб рэгістры і яго ролі ў стварэнні мастацкага вобраза.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб | Знаёмства з паняццем *рэгістр*.<br>Чытанне і меладэкламацыя чатырохрадкоўяў у нізкім, сярэднім і высокім рэгістрах (ад імя розных персанажаў: мядзведзя, зайца, камара). | С. 50—57 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | высокіх і нізкіх гуках;<br>2) увядзенне паняцця *рэгістр*;<br>3) фарміраванне ўмення назіраць за зменамі рэгістраў у музычным творы;<br>4) выяўленне выразных і выяўленчых магчымасцей рэгістраў у музыцы;<br>5) фарміраванне ўмення самастойна мадэляваць мастацкі вобраз, выкарыстоўваючы выразныя магчымасці рэгістраў | Агучванне казкі «Церамок» з суправаджэннем рэплік герояў ігрой на фартэпіяна ў адпаведным рэгістры.<br>Развучванне папеўкі «Кто нам сейчас споет» (муз. і сл. В. Каваліва) з паказам рукой вышыні гучання голасу; выкананне папеўкі па ролях.<br>Праслухоўванне і параўнальны аналіз твораў «Мядзведзь» В. Рэбікава, «Шэсце конікаў» С. Пракоф'ева, «Матылёк» С. Майкапара, «Зайчык дражніць медзведзяня» Д. Кабалеўскага; перадача характару герояў твораў пластычнымі сродкамі.<br>Інструментальная імправізацыя на зададзеную тэму («Самая высокая гара», «Самая глыбокая ўпадзіна», «Размова дзядулі і ўнучкі» і інш.) з выкарыстаннем выразных магчымасцей рэгістра.<br>Развучванне песні «Сурок» (муз. Л. Бетховена, сл. І. Гётэ).<br>Знаёмства з назвамі мужчынскіх і жаночых галасоў: *тэнар*, *барытон*, *бас*, *сапрана*, *меццa-сапрана*, *кантральта*.<br>Слуханне і параўнальны аналіз вакальных твораў у выкананні выдатных спевакоў і спявачак, якія маюць высокія, сярэднія і нізкія галасы. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Развучванне песні «Малиновка» (муз. Л. Бетховена, сл. Г. Бюргера).<br>Пісьмовая работа па асваенні нотнай граматы (запіс на нотным стане гукаў рознай вышыні, у тым ліку работа з дадатковымі лінейкамі) | |
| 14<br>15 | Тэмбр — афарбоўка музычных галасоў | 2 | *Мэта*: сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб тэмбры і яго ролі ў стварэнні мастацкага вобраза.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб «халодным» і «цёплым» у музыцы;<br>2) увядзенне паняцця *тэмбр*;<br>3) знаёмства з вакальнымі і інструментальнымі тэмбрамі;<br>4) фарміраванне ўмення адрозніваць вакальныя, інструментальныя тэмбры;<br>5) выяўленне выразных і выяўленчых магчымасцей тэмбру ў музыцы;<br>6) фарміраванне ўмення выкарыстоўваць тэмбры музычных інструментаў ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>7) развіццё тэмбравага слыху | Праслухоўванне і параўнальны аналіз твора «Палёт чмяля» М. Рымскага-Корсакава ў розных варыянтах выканання (фартэпіяна, ксілафон, труба, баян, хор).<br>Увядзенне паняцця *тэмбр*.<br>Развучванне песні «Музыканты» (муз. А. Рэмізоўскай, сл. Э. Агняцвет).<br>Імітацыя ігры на інструментах (скрыпцы, дудцы, барабане, баяне) пры выкананні прыпеву.<br>Праслухоўванне фрагментаў сімфанічнай казкі «Пеця і воўк» С. Пракоф'ева; слоўнае апісанне гучання розных інструментаў.<br>Суаднясенне тэмбраў музычных інструментаў, якія выкарыстоўваюцца ў сімфанічнай казцы, з вобразамі герояў.<br>Слуханне інструментальных твораў «Вясковыя музыкі» В. Помазава і «Ваенны марш» Г. Свірыдава; параўнанне настрою, які ствараецца рознымі інструментальнымі саставамі. | С. 58—65 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Знаёмства з саставам аркестра народных інструментаў і аркестра духавых інструментаў.<br>Слуханне вакальнага твора ў розным выкананні (рознымі галасамі).<br>Развучванне беларускай народнай каляднай песні «Каляда, Каляда, дай, баба, пірага».<br>Правядзенне музычнай гульні-віктарыны па вызначэнні вакальных і інструментальных тэмбраў.<br>Развучванне навагодняй песні «Ёлка-вясёлка» (муз. В. Каваліва, сл. М. Чарняўскага).<br>Пісьмовая работа па асваенні нотнай граматы (выкананне гульнявых заданняў-практыкаванняў на выбар настаўніка) | |
| 16 | Абагульняючы ўрок па тэме «Сродкі музычнай выразнасці» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні аб сродках музычнай выразнасці.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя ўяўленняў аб сродках музычнай выразнасці;<br>2) абагульненне ўяўленняў аб выразных і выяўленчых магчымасцях сродкаў музычнай выразнасці;<br>3) удасканальванне ўмення вы- | Работа з пытаннямі абагульняючага ўрока з вучэбнага дапаможніка.<br>Гульнявая дзейнасць (загадкі, рэбусы і г. д.), накіраваная на паўтарэнне назваў нот (*до*, *рэ*, *мі*, *фа*, *соль*, *ля*, *сі*) і іх размяшчэння на нотным стане.<br>Правядзенне гульні «Рытмічнае рэха» (з выкарыстаннем роўных працяглацей і пункцірнага рытму).<br>Перадача асаблівасцей сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных у тво- | С. 66–67 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | значаць па асаблівасцях музычнай мовы эмацыянальна-вобразны змест музычнага твора;<br>4) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | ры, пры дапамозе мадэлявання (колеравага, слоўнага, пластычнага).<br>Мадэляванне мастацка-творчага працэсу: адбор сродкаў музычнай выразнасці для стварэння мелодыі да чатырохрадкоўя.<br>Паўтарэнне песень, развучаных на працягу паўгоддзя.<br>Выбар навучэнцамі музычных твораў, якія найбольш запомніліся і спадабаліся, з праслухоўваннем асобных фрагментаў | |
| **II паўгоддзе**<br>**Падарожжа ў музычныя краіны — Оперу, Балет, Сімфонію, Канцэрт (18 г)** | | | | | |
| 17 | Песня, танец, марш запрашаюць у падарожжа | 1 | *Мэта*: паглыбіць уяўленне аб асноўных жанрах музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб першасных жанрах музыкі — песні, танцы і маршы;<br>2) замацаванне ўмення адрозніваць песню, танец і марш у працэсе ўспрымання музыкі;<br>3) удасканальванне ўмення выкарыстоўваць выразныя асаблівасці песні, танца і марша ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>4) развіццё ўяўлення, фантазіі | Слуханне і выяўленне жанравай асновы знаёмых твораў (песень, танцаў, маршаў) на выбар настаўніка.<br>Праслухоўванне п’есы «Марш драўляных салдацікаў» П. Чайкоўскага са зборніка «Дзіцячы альбом».<br>Аналіз музычнай мовы і вобразнага строю твора.<br>Рытмадэкламацыя ў рытме марша верша В. Луніна «Марш деревянных солдатиков».<br>Выкананне пластычнай імправізацыі ў працэсе слухання нумара «Танец першай сняжынкі» з сюіты «Поры | С. 68—71 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | года» В. Карэтнікава.<br>Развучванне песні «Мядзведзеў сон» (муз. Э. Зарыцкага, сл. В. Жуковіча).<br>Развучванне і выкананне на музычных інструментах рытмічнай двухгалоснай/трохгалоснай кампазіцыі з танцавальнай/маршавай жанравай асновай (на выбар настаўніка) | |
| 18<br>19 | Інструменты сімфанічнага аркестра | 2 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб сімфанічным аркестры.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб музычных інструментах і іх асаблівасцях;<br>2) азнаямленне з саставам сімфанічнага аркестра;<br>3) фарміраванне ўяўленняў аб выразных магчымасцях сімфанічнага аркестра;<br>4) фарміраванне ўмення адрозніваць інструменты сімфанічнага аркестра па тэмбры;<br>5) развіццё тэмбравага слыху | Знаёмства з устройствам сімфанічнага аркестра: асноўнымі групамі інструментаў, знешнім выглядам інструментаў і іх гучаннем, работай дырыжора.<br>Знаёмства з выразнымі і выяўленчымі магчымасцямі аркестравай музыкі. Прагляд відэафрагментаў (на выбар настаўніка), якія ілюструюць ігру сімфанічнага аркестра (агульны план) і яго асобных груп.<br>Слуханне фрагмента I часткі сімфоніі № 2 «Акіян» А. Рубінштэйна. Вызначэнне таго, што выражае і што адлюстроўвае музыка. Назіранне за гучаннем аркестра і яго асобных груп. Вольнае дырыжыраванне творам у працэсе яго паўторнага праслухоўвання.<br>Развучванне «Песни о дирижере» (муз. і сл. В. Каваліва). Дырыжыраванне песняй з паказам моцных доляў. | С. 72—79 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Параўнанне гучання п'есы «Люты» П. Чайкоўскага з цыклу «Поры года» ў фартэпіянным і аркестравым выкананні.<br>Знаёмства з выразнымі і выяўленчымі магчымасцямі групы струнных смычковых інструментаў. Слуханне полькі «Трык-трак», «Піцыката-полькі» І. Штрауса. Імітацыя ігры на скрыпцы. Слуханне тэмы чароўных пераўтварэнняў з серыі фільмаў пра Гары Потэра (муз. Дж. Уільямса). Знаёмства з выразнымі магчымасцямі чалесты | |
| 20<br>21<br>22 | Музычнае падарожжа ў краіну Оперу | 3 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб жанры оперы.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне з асноўнымі паняццямі і спецыфічнымі асаблівасцямі жанру оперы;<br>2) азнаямленне з фрагментамі опер;<br>3) фарміраванне ўмення распазнаваць жанры песні, танца і марша ў працэсе ўспрымання фрагментаў опернага спектакля;<br>4) фарміраванне ўмення выконваць песню з элементамі тэатралізацыі;<br>5) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | Знаёмства з асаблівасцямі опернага спектакля. Прагляд відэафрагментаў оперных спектакляў (на выбар настаўніка).<br>Знаёмства з правіламі паводзін у оперным тэатры.<br>Праслухоўванне фрагментаў оперы «Чароўная флейта» (муз. В. А. Моцарта). Пашырэнне ўяўленняў аб оперных нумарах (арыя, вакальны дуэт, хор) і іх ролі ў оперным спектаклі.<br>Праслухоўванне фрагментаў з дзіцячай оперы «Муха-Цакатуха» (муз. М. Красева, сл. К. Чукоўскага); вызначэнне жанравай асновы праслуханых фрагментаў. Выразнае выкананне асобных нумароў. | С. 80—95 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Актуалізацыя ведаў аб казцы братоў Грым «Воўк і сямёра казлянят». Параўнанне дзеючых асоб казкі і аднайменнай оперы (муз. М. Каваля, сл. Я. Манучаравай). Мадэляванне мастацка-творчага працэсу (вызначэнне галасавых характарыстык галоўных дзеючых асоб оперы).<br>Праслухоўванне фрагментаў з дзіцячай оперы «Воўк і сямёра казлянят»; вызначэнне жанравай асновы праслуханых фрагментаў; развучванне асноўных тэм дзіцячай оперы, выкананне оперных нумароў з элементамі тэатралізацыі.<br>Развучванне песні «Солнечная капель» (муз. С. Сасніна, сл. І. Вахрушавай). Суправаджэнне прыпеву песні ігрой на музычных інструментах, якая імітуе звон вясновага капяжу | |
| 23<br>24<br>25 | Музычнае падарожжа ў краіну Балет | 3 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб жанры балета.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб жанры танца, відах танцаў;<br>2) азнаямленне з асноўнымі паняццямі жанру балета;<br>3) выяўленне асаблівасцей балета як сінтэтычнага віду ма- | Знаёмства з паняццямі *балет*, *балетмайстар*, *кардэбалет*, *балерына*, *танцоўшчык*. Прагляд відэафрагментаў балетных спектакляў (на выбар настаўніка).<br>Праслухоўванне фрагментаў балета «Шчаўкунок» П. Чайкоўскага; вызначэнне жанравай асновы праслуханых фрагментаў. | С. 96—107 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | стацтва;<br>4) фарміраванне ўмення распазнаваць жанры танца і марша ў працэсе ўспрымання фрагментаў балетнага спектакля;<br>5) фарміраванне ўмення ствараць мастацкі вобраз пластычнымі сродкамі;<br>6) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | Выразнае чытанне верша Т. Шарыгінай «Снежинка-балеринка»; стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове дадзенага верша.<br>Чытанне фрагмента казкі Антуана дэ Сент-Экзюперы «Маленькі прынц»; мадэляванне мастацка-творчага працэсу па стварэнні музыкі да прачытанага ўрыўка.<br>Праслухоўванне фрагментаў балета «Маленькі прынц» Я. Глебава, параўнанне ўласнай задумы музычнага ўвасаблення мастацкіх вобразаў з вобразамі, створанымі кампазітарам.<br>Суправаджэнне паўторнага слухання фрагментаў балета «Маленькі прынц» рухамі, якія адпавядаюць характару музыкі.<br>Развучванне песні «Волшебный цветок» (муз. Ю. Чычкова, сл. М. Пляцкоўскага). Выкананне прыпеву песні з гучальнымі жэстамі.<br>Праслухоўванне фрагментаў балета «Залаты ключык» А. Хадоскі; вызначэнне жанравай і відавой асновы праслуханых фрагментаў.<br>Развучванне і выразнае выкананне «Песни папы Карло» (муз. А. Рыбнікава, сл. Б. Акуджавы) | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 26<br>27 | Музычнае падарожжа ў краіну Сімфонію | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб жанры сімфоніі.<br>*Задачы*:<br>1) выяўленне асаблівасцей жанру сімфоніі;<br>2) азнаямленне з фрагментамі сімфоній;<br>3) знаёмства з паняццем *сімфаньета*;<br>4) фарміраванне ўмення назіраць за зменамі характару знаёмай мелодыі ў сімфанічнай музыцы;<br>5) развіццё ўмення распазнаваць жанры песні, танца і марша ў працэсе ўспрымання фрагментаў сімфанічнай музыкі;<br>6) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | Гутарка аб жанры сімфоніі, яго спецыфічных асаблівасцях. Слуханне фрагментаў (асобных частак) сімфоній (на выбар настаўніка).<br>Віртуальнае падарожжа па знакамітых канцэртных залах свету (Карнегі-Хол у Нью-Ёрку, Берлінская філармонія, Беларуская дзяржаўная філармонія ў Мінску і інш.).<br>Знаёмства з правіламі паводзін у канцэртнай зале.<br>Слуханне і аналіз музычнай мовы сімфоніі № 94 «Сюрпрыз» (фрагменты II і IV частак) (муз. І. Гайдна); вызначэнне жанравай асновы праслуханых фрагментаў.<br>Выкананне мелодыі дзіцячай песні, выкарыстанай І. Гайднам у II частцы сімфоніі № 94; вольнае дырыжыраванне ўяўным аркестрам у працэсе паўторнага слухання IV часткі сімфоніі.<br>Развучванне песні «Мы дружим с музыкой» (муз. І. Гайдна, рускі тэкст П. Сіняўскага). Суправаджэнне песні ігрой на дзіцячых музычных інструментах.<br>Знаёмства з паняццем *аркестравая партытура*. Аналіз старонкі аркестравай партытуры В. А. Моцарта. | С. 108—115 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Слуханне фрагмента I часткі сімфоніі № 1 (муз. В. А. Моцарта). Вызначэнне эмацыянальнага стану, перададзенага ў музыцы. Назіранне за гучаннем розных інструментаў.<br>Слуханне фрагмента I часткі сімфоніі № 40 (муз. В. А. Моцарта). Вызначэнне эмацыянальнага стану, перададзенага ў музыцы. Выяўленне выразных магчымасцей інструментаў струнна-смычковай групы.<br>Знаёмства з паняццем *сімфаньета*.<br>Слуханне фрагмента IV часткі сімфаньеты «Беларускія карцінкі» М. Чуркіна.<br>Развучванне беларускай народнай песні «Пайшоў Ясь наш на лужок». Выкананне песні з рытмічным акампанементам | |
| 28<br>29 | Музычнае падарожжа ў краіну Канцэрт | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб жанры канцэрта.<br>*Задачы*:<br>1) фарміраванне ўяўлення аб канцэрце як музычным спаборніцтве;<br>2) увядзенне паняцця *канцэрт*;<br>3) развіццё ўмення прасочваць процістаянне інструмента, які саліруе, і аркестра; | Знаёмства з паняццем *канцэрт*.<br>Прагляд відэафрагмента (на выбар настаўніка) з дэманстрацыяй выканання канцэрта салістам і аркестрам.<br>Праслухоўванне фрагмента I часткі канцэрта для флейты з аркестрам «Шчыгляня» А. Вівальдзі; назіранне за спаборніцтвам інструмента, які саліруе, і аркестра.<br>Выразнае чытанне верша Я. Коласа | С. 116—121 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 4) навучанне мадэляванню музычнага спаборніцтва ў працэсе элементарнага музіцыравання;<br>5) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | «Раніца вясною»; стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове вершаванага тэксту.<br>Развучванне песні «Ручей» (муз. М. Парцхаладзэ, пераклад з грузінскай А. Гурына); выкананне песні, дапоўненае ігрой на музычных інструментах.<br>Слуханне фрагмента I часткі Канцэрта для дуэта цымбалаў з аркестрам (муз. Д. Камінскага); назіранне за зменай характару знаёмай мелодыі ў музыцы канцэрта. Характарыстыка гучання цымбалаў.<br>Паўтарэнне беларускай народнай песні «Саўка ды Грышка»; выкананне песні з рытмічным суправаджэннем.<br>Правядзенне музычнай віктарыны на вызначэнне ў канцэртах інструмента (на выбар настаўніка), які саліруе.<br>Прагляд канцэртных выступленняў юных музыкантаў: піяністаў, скрыпачоў і інш. (на выбар настаўніка). Вызначэнне ўдзельнікаў музычных спаборніцтваў; абмеркаванне прагледжаных нумароў | |
| 30<br>31<br>32 | Як сябруюць з музыкай іншыя віды мастацтва | 3 | *Мэта*: паглыбіць уяўленні аб узаемасувязі музыкі з іншымі відамі мастацтва. | Мадэляванне мастацка-творчага працэсу па стварэнні оперы, балета ці сімфанічнай казкі на казачны сюжэт | С. 122—131 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | *Задачы*:<br>1) фарміраванне агульнага ўяўлення аб відах мастацтва, якія існуюць, іх узаемасувязі і ўзаемапранікненні;<br>2) фарміраванне ўмення спалучаць уласную музычную дзейнасць з элементамі іншых відаў мастацтва;<br>3) развіццё творчых здольнасцей | Х. К. Андэрсена «Дзюймовачка»: вызначэнне салістаў; апісанне музыкі, якая характарызуе кожнага героя; адбор інструментаў, якія ўдзельнічаюць у стварэнні вобразаў; апісанне сцэнічных рухаў кожнага героя, іх касцюмаў (для оперы, балета). Прэзентацыя творчых работ, выкананых ва ўмовах групавога ўзаемадзеяння.<br>Развучванне песні «Вожык» (муз. А. Чыркуна, сл. В. Лукшы). Развучванне трохгалоснай рытмічнай партытуры да песні з рытмічным суправаджэннем.<br>Слуханне нумароў «Вальс», «Поўнач» з балета «Папялушка» С. Пракоф'ева. Аналіз выразных і выяўленчых сродкаў, выкарыстаных кампазітарам. Прадумванне дэкарацый да спектакля.<br>Праслухоўванне «Марша Чарнамора» з оперы «Руслан і Людміла» М. Глінкі; аналіз музычнай мовы аркестравага нумара. Чытанне ўрыўка з паэмы А. Пушкіна «Руслан и Людмила». Прадумванне касцюма Чарнамора; увасабленне творчай задумы любымі, на выбар навучэнцаў, мастацкімі сродкамі (каляровымі алоўкамі, фла- | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | мастарамі, пластылінам і інш.).<br>Слуханне п’есы «Акварыум» (з сюіты «Карнавал жывёл») К. Сен-Санса. Абмен уражаннямі аб тэмбры, выразных і выяўленчых магчымасцях незвычайнага інструмента — шкляной гармонікі.<br>Гутарка аб ролі музыкі ў мультыплікацыйных і мастацкіх фільмах.<br>Слуханне музычнай тэмы Дзё Хісаісі з мультфільма «Вандроўны замак». Аналіз музычнай мовы тэмы, вызначэнне яе жанравай асновы.<br>Развучванне і выразнае выкананне песень «Ничего на свете лучше нету», «Ох, рано встает охрана» (муз. Г. Гладкова, сл. Ю. Энціна) з мультфільма «Брэменскія музыканты» | |
| 33 | Куды прывялі нас песня, танец, марш | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленне аб жанрах оперы, балета, сімфоніі і канцэрта.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя ўяўленняў аб характэрных асаблівасцях асноўных жанраў у музыцы;<br>2) удасканальванне ўмення распазнаваць песню, танец, марш у працэсе ўспрымання оперы, балета, сімфоніі, канцэрта; | Прагляд відэасюжэтаў оперных і балетных нумароў; праслухоўванне фрагментаў сімфанічнай і канцэртнай музыкі. Вызначэнне асноўных музычных жанраў (песні, танца, марша) у оперы, балеце, сімфоніі, канцэрце.<br>Паўтарэнне песень, якія атрымалі другое жыццё ў жанрах оперы, балета, сімфоніі, канцэрта.<br>Слуханне аркестравай карціны «Тры цуды» з оперы «Казка пра цара Сал- | С. 132—137 |

*Заканчэнне*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 3) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | тана» М. Рымскага-Корсакава; вызначэнне жанравай асновы кожнага «цуду» | |
| 34 | Абагульняючы ўрок па тэме «Падарожжа ў музычныя краіны — Оперу, Балет, Сімфонію, Канцэрт» | 1 | *Мэта*: абагульніць веды, атрыманыя на працягу другога паўгоддзя і ўсяго вучэбнага года.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя ўяўленняў аб сродках музычнай выразнасці і жанрах музыкі;<br>2) выкарыстанне уменняў, атрыманых на працягу года, ва ўласнай мастацкай дзейнасці;<br>3) развіццё слухацкай і выканальніцкай культуры | Работа па пытаннях абагульняючага ўрока з вучэбнага дапаможніка.<br>Правядзенне відэа- або аўдыявіктарыны па музычных творах/тэмах, вывучаных на працягу года.<br>Выкананне песень, якія найбольш спадабаліся, з ліку тых, што былі вывучаны на працягу года | С. 138—139 |

## 3 КЛАС

35 г

Гуляева, А. Р. Музыка : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : для работы ў кл. / А. Р. Гуляева, М. Б. Гарбунова, І. В. Яшчэмбская-Калёса. — Мінск : Пачатковая школа, 2017. — 168 с.

| № урока і дата правя-дзення | Тэма ўрока | Коль-касць гадзін | Мэта і задачы ўрока | Асноўныя віды і спосабы дзейнасці | Матэрыял вучэбнага дапамож-ніка |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **І чвэрць<br>Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы (8 г)** | | | | | |
| 1 | Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб песенным, танцавальным і маршавым характары музычнай мовы.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб першасных музычных жанрах — песні, танцы, маршы;<br>2) актуалізацыя ўяўленняў аб сродках музычнай выразнасці;<br>3) фарміраванне першапачатковых уяўленняў аб песеннасці, танцавальнасці, маршавасці;<br>4) развіццё ўменняў самастойна адбіраць і выкарыс- | Выкананне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.<br>Выкананне, слуханне вывучанага раней музычнага матэрыялу, якому ўласцівы рысы песеннасці, танцавальнасці, маршавасці.<br>Выяўленне характэрных асаблівасцей песеннай, танцавальнай, маршавай музычнай мовы.<br>Складанне пераліку прымет, якія характарызуюць песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы.<br>Вызначэнне характару музычнай мовы ў музычных творах.<br>Асэнсаванне вопыту стварэння музычных фрагментаў песеннага, танцавальнага і маршавага характару. | С. 5—14 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | тоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 2<br>3 | Песенны характар музычнай мовы | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб характэрных асаблівасцях песеннай музычнай мовы.<br>*Задачы*:<br>1) увядзенне паняцця *песеннасць;*<br>2) азнаямленне вучняў з асноўнымі характарыстыкамі песеннай музычнай мовы;<br>3) удасканальванне ўменняў кантыленнага спявання;<br>4) развіццё меладычнага слыху | Выразнае чытанне верша Я. Купалы «Дуб».<br>Развучванне песні «Дуб» (муз. А. Чыркуна, сл. Я. Купалы).<br>Вызначэнне характару музычнай мовы.<br>Выразнае выкананне песні, дапоўненае пластычным інтанаваннем.<br>Слуханне фрагмента «Правінцыяльнай сімфоніі» Д. Лыбіна (III частка).<br>Вызначэнне характару музычнай мовы.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мелодыі песеннага характару (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне «Старадаўняй французскай песенькі» з «Дзіцячага альбома» П. Чайкоўскага. Вызначэнне характару музычнай мовы. Выкананне «Старадаўняй французскай песенькі» з тэкстам Э. Аляксандравай.<br>Слуханне «Дуэта Машы і Прынца» з балета «Шчаўкунок» П. Чайкоўскага. Выкананне мелодыі на гукавышынных інструментах. Вызначэнне характару музычнай мовы.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне інструментальнай партытуры (трох- | С. 15—26 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | вугольнікі, званочкі, металафон) на аснове «Дуэта Машы і Прынца» з балета «Шчаўкунок» П. Чайкоўскага (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 4<br>5 | Танцавальны характар музычнай мовы | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб характэрных асаблівасцях танцавальнай музычнай мовы.<br>*Задачы*:<br>1) увядзенне паняцця *танцавальнасць*;<br>2) азнаямленне вучняў з асноўнымі характарыстыкамі танцавальнай музычнай мовы;<br>3) удасканальванне ўменняў выразнага спявання і руху пад музыку;<br>4) развіццё рытмічнага пачуцця | Выразнае чытанне верша М. Карэма ў перакладзе Э. Агняцвет «Тра-ля-ля-ля-ля». Выяўленне характэрных рыс танцавальнасці.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша «Тра-ля-ля-ля-ля» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Развучванне беларускай народнай песні-танца «Мікіта».<br>Вызначэнне характару музычнай мовы.<br>Выразнае выкананне песні-танца.<br>Слуханне часткі «Заўжды ляці» з араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства» (муз. Я. Глебава, сл. П. Макаля). Вызначэнне характару музычнай мовы. Вольнае дырыжыраванне творам.<br>Развучванне песні «Лесной праздник» (муз. Ж. Металідзі, сл. А. Фаткіна).<br>Вызначэнне характару музычнай мовы.<br>Выразнае выкананне твора з улікам выяўленых рыс танцавальнасці. | С. 27—37 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Слуханне твора «Папяровая балерына» Г. Гарэлавай. Вызначэнне характару музычнай мовы.<br>Перадача малюнка мелодыі сродкамі графікі (у сшытку).<br>Слуханне фрагмента з «Арагонскай хоты» М. Глінкі. Вызначэнне характару музычнай мовы.<br>Выяўленне ў музычнай тканіне скачкоў, акцэнтаў. Работа з партытурай твора (калектыўна).<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне рытмічнай партытуры, якая падкрэслівае танцавальны характар музычнай мовы «Арагонскай хоты» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 6<br>7 | Маршавы характар музычнай мовы | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб характэрных асаблівасцях маршавай музычнай мовы.<br>*Задачы*:<br>1) увядзенне паняццяў *маршавасць, пункцірны рытм*;<br>2) азнаямленнне вучняў з характэрнымі асаблівасця- | Выразнае чытанне верша Г. Віеру ў перакладзе Я. Акіма «Ёжик и барабан».<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша Г. Віеру «Ёжик и барабан» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне твора Г. Вагнера «Крокі». Вызначэнне характару музычнай мовы. | С. 37—50 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | мі маршавай музычнай мовы;<br>3) удасканальванне ўмення выразна рухацца пад музыку;<br>4) развіццё пачуцця метрарытму | Стварэнне невялікага апавядання па матывах твора (па жаданні, індывідуальна).<br>Развучванне песні А. Даньшовай на словы А. Зарубіна «Песенка слонёнка о самом себе». Вызначэнне характару музычнай мовы. Выразнае выкананне твора з рытмічным акампанементам.<br>Развучванне «Песенькі Каваля» з оперы «Адчыніце, казляняткі» (муз. А. Залётнева, сл. П. Макаля). Вызначэнне характару музычнай мовы. Выразнае выкананне твора з улікам выяўленых рыс маршавасці.<br>Слуханне Паланэза Ф. Шапэна. Вызначэнне характару музычнай мовы. Вызначэнне метра (пульсу). Вырашэнне супярэчнасці паміж трохдольным метрам і адчуваннем кроку. Пошукі аргументаў, прапанова гіпотэз.<br>Слуханне Першай інтэрмедыі з араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства» (муз. Я. Глебава). Вызначэнне характару музычнай мовы крайніх і сярэдняй частак.<br>Стварэнне невялікага апавядання паводле Першай інтэрмедыі (індывідуальна).<br>Абмеркаванне атрыманых вынікаў. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 8 | Абагульняючы ўрок па тэме «Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні аб песеннасці, танцавальнасці, маршавасці.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя набытых ведаў, абагульненне вопыту практычнай музычнай дзейнасці;<br>2) аперыраванне паняццямі *песеннасць, танцавальнасць, маршавасць*;<br>3) удасканальванне выканальніцкіх і слухацкіх уменняў | Выкананне і слуханне музычных твораў на выбар навучэнцаў і настаўніка.<br>Прэзентацыя мастацка-творчых (даследчых) праектаў па тэме «Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы».<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 51 |
| **II чвэрць<br>Інтанацыя (8 г)** | | | | | |
| 9 | Выразнасць слова, музыкі, руху | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб інтанацыі.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне вучняў з інтанацыяй як выразнасцю слова, гуку, руху;<br>2) фарміраванне ўмення мадэляваць інтанацыі сло- | Выкананне фрагментаў вывучаных раней музычных, літаратурных твораў, танцавальных кампазіцый. Асэнсаванне на гэтай аснове паняцця выразнасці. Складанне пераліку эмацыянальных станаў.<br>Выразнае чытанне верша «Разговор с пчелой» М. Барадзіцкай (з выкарыстаннем выразных рухаў). Вызначэнне | С. 52—55 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | вам, гукам, рухам;<br>3) удасканальванне ўменняў выразнага спявання, інструментальнага музіцыравання, руху пад музыку;<br>4) развіццё творчых здольнасцей | эмацыянальных станаў, перададзеных у вершы. Выяўленне элементаў гукапераймання.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора «Разговор с пчелой» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне твора «Палёт чмяля» М. Рымскага-Корсакава. Вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, якія выкарыстаў кампазітар для перадачы гудзення, набліжэння і аддалення чмяля.<br>Слуханне ўступу «Акіян-мора сіняе» да оперы «Садко» М. Рымскага-Корсакава. Вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, якія выкарыстаў кампазітар для перадачы карціны мора.<br>Вольнае дырыжыраванне творам.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 10 | Блізкасць маўленчай і музычнай інтанацыі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб інтанацыі як агульнай аснове маўлення і музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя існуючага выканальніцкага вопыту; | Развучванне беларускай народнай песні «Як пагнала бабуленька куранятак пасці».<br>Выяўленне падабенства і адрозненняў у перадачы эмацыянальных станаў пры дапамозе маўленчай і музычнай інтанацыі. | С. 56—61 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2) фарміраванне ўяўленняў аб блізкасці маўленчай і музычнай інтанацыі;<br>3) удасканальванне ўменняў выконваць літаратурныя і музычныя творы;<br>4) развіццё ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Выразнае выкананне, інсцэніроўка песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора «Няньчына казка» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне п’есы «Няньчына казка» з «Дзіцячага альбома» П. Чайкоўскага. Стварэнне невялікага апавядання паводле твора.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 11 | Зерне-інтанацыя | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб зерні-інтанацыі.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне вучняў з характэрнымі асаблівасцямі зерня-інтанацыі;<br>2) фарміраванне ўмення вызначаць характар зерня-інтанацыі;<br>3) фарміраванне ўмення выконваць зерні-інтанацыі на гукавышынных інструментах;<br>4) фарміраванне ўмення развіваць мелодыю з зерня-інтанацыі | Выкананне фрагментаў вывучаных раней музычных твораў (на выбар настаўніка). Вылучэнне зерняў-інтанацый з музычнай тканіны.<br>Вызначэнне характару зерняў-інтанацый.<br>Развучванне беларускай народнай песні «Сеў жучок на сучок». Вылучэнне зерня-інтанацыі, вызначэнне яе характару. Назіранне за развіццём мелодыі з зерня-інтанацыі.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне розных варыянтаў развіцця мелодыі з зерня-інтанацыі беларускай народнай песні «Сеў жучок на сучок» (калектыўна або індывідуальна). Абмеркаванне атрыманых вынікаў. | С. 61—63 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Слуханне твора «Восеньскі малюнак» Я. Паплаўскай. Выяўленне зерня-інтанацыі, вызначэнне яе характару.<br>Назіранне за тым, як з зерня-інтанацыі вырастае мелодыя. Стварэнне невялікага апавядання паводле твора «Восеньскі малюнак» (па жаданні, індывідуальна).<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 12 | Выразная інтанацыя | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб выразнай інтанацыі.<br>*Задачы*:<br>1) паглыбленне ўяўленняў аб выразнасці;<br>2) азнаямленне вучняў з музычнымі інтанацыямі, якія перадаюць пачуццё, настрой;<br>3) удасканальванне ўменняў выразнага спявання і інструментальнага музіцыравання;<br>4) фарміраванне ўмення мадэляваць выразныя інтанацыі словам, гукам, рухам | Выразнае чытанне верша М. Карэма «Радость» у перакладзе В. Берастава.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша М. Карэма (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Развучванне «Веселой песенки» або «Грустной песенки» (муз. Г. Струвэ, сл. В. Віктарава). Вызначэнне эмацыянальнага стану, перададзенага ў музыцы. Складанне «колеравай партытуры», якая перадае настрой твора. Выразнае выкананне песні.<br>Слуханне «Песні Сольвейг» Э. Грыга (з музыкі да драмы Г. Ібсена «Пэр Гюнт»). Выяўленне эмацыянальных станаў, перададзеных у музыцы. Скла- | С. 63—71 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | данне «колеравай партытуры», якая перадае настрой твора.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 13 | Выяўленчая інтанацыя | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб выяўленчай інтанацыі.<br>*Задачы*:<br>1) паглыбленне ўяўленняў аб выяўленчых магчымасцях музыкі;<br>2) азнаямленне вучняў з музычнымі інтанацыямі, якія адлюстроўваюць з'явы навакольнага свету;<br>3) фарміраванне ўмення мадэляваць выяўленчыя інтанацыі;<br>4) удасканальванне навыку гукаперайманrepresents | Развучванне швейцарскай народнай песні «Зязюля». Вылучэнне выяўленчай інтанацыі. Выкананне інтанацыі, якая перадае кукаванне зязюлі, голасам або на гукавышынных інструментах.<br>Выразнае выкананне песні.<br>Слуханне фрагмента з II часткі Сімфоніі № 101 «Гадзіннік» І. Гайдна. Вылучэнне выяўленчай інтанацыі. Назіранне за развіццём музыкі.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне выяўленчай інтанацыі, якая перадае ход (бой) гадзінніка (калектыўна або індывідуальна). Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Слуханне твора «Гадзіннік» У. Кур'яна. Вылучэнне выяўленчых інтанацый.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 71—75 |
| 14<br>15 | Выразныя і выяўленчыя інтанацыі сустракаюцца ў адным музычным творы | 2 | *Мэта:* сфарміраваць уяўленне аб поліінтанацыйным характары музычнага твора.<br>*Задачы*:<br>1) пашырэнне ўяўленняў аб выразных і выяўленчых ін- | Развучванне песні «Зіма» (муз. І. Лучанка, сл. Я. Коласа) або «Зима» (муз. Ц. Кюі, сл. Я. Баратынскага). Вылучэнне выяўленчых інтанацый. Вызначэнне эмацыянальнага стану, перададзенага ў музыцы. | С. 76—84 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | танацыях;<br>2) фарміраванне ўмення адрозніваць выразныя і выяўленчыя інтанацыі ў музычным творы;<br>3) удасканальванне ўменняў выразнага спявання і інструментальнага музіцыравання;<br>4) развіццё ўяўлення і фантазіі | Выразнае выкананне песні.<br>Выразнае чытанне верша Я. Купалы «Мароз».<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша Я. Купалы «Мароз» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне твора «У зімовым лесе» В. Карэтнікава (з сюіты «Поры года»). Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне выразных і выяўленчых інтанацый.<br>Выразнае чытанне верша М. Чарняўскага «Новы год».<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша М. Чарняўскага «Новы год» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Развучванне песні «Навагодні карагод» (муз. І. Лучанка, сл. В. Лучанок). Вызначэнне эмацыянальнага стану, перададзенага ў музыцы.<br>Выразнае выкананне песні.<br>Слуханне твора «Вальс каля навагодняй ёлкі» В. Карэтнікава (з сюіты «Поры года»). Вылучэнне выяўленчай інтанацыі (бой гадзінніка), вызначэнне эмацыянальнага стану, перададзенага ў музыцы. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 16 | Абагульняючы ўрок па тэме «Інтанацыя» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні навучэнцаў аб інтанацыі.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя набытых ведаў, абагульненне вопыту практычнай музычнай дзейнасці;<br>2) аперыраванне паняццямі *інтанацыя*, *зерне-інтанацыя*, *выразная інтанацыя* і *выяўленчая інтанацыя;*<br>3) удасканальванне слухацкіх і выканальніцкіх уменняў | Слуханне і выкананне музычных твораў на выбар навучэнцаў і настаўніка.<br>Прэзентацыя мастацка-творчых (даследчых) праектаў па тэме «Інтанацыя».<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 85 |
| **III чвэрць**<br>**Развіццё музыкі (10 г)** | | | | | |
| 17 | Як расказваюць і слухаюць музычныя гісторыі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць першапачатковае ўяўленне аб развіцці музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) увядзенне паняцця *развіццё музыкі*;<br>2) азнаямленне вучняў з асноўнымі спосабамі развіцця музыкі;<br>3) выяўленне ролі сродкаў | Развучванне песні «Почему медведь зимой спит» (муз. Л. Кніпера, сл. А. Каваленкава). Выяўленне сродкаў выразнасці, пры дапамозе якіх кампазітар развівае музычны вобраз. Выразнае выкананне песні з улікам дынамічных і тэмпавых змяненняў. Інсцэніроўка песні.<br>Слуханне I часткі канцэрта для скрыпкі з аркестрам «Зіма» А. Вівальдзі. | С. 86—89 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | музычнай выразнасці ў развіцці музыкі;<br>4) удасканальванне слухацкіх і выканальніцкіх уменняў | Выяўленне ролі сродкаў музычнай выразнасці ў развіцці музыкі.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 18 | Як развівае музыку кампазітар | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб сродках развіцця музыкі, якія выкарыстоўвае кампазітар.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя назапашанага навучэнцамі вопыту музычнай дзейнасці;<br>2) фарміраванне ўменняў выяўляць комплекс выразных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў дзейнасці кампазітара;<br>3) фарміраванне элементарных кампазітарскіх уменняў;<br>4) развіццё творчых здольнасцей | Слуханне твора «Снежны гарадок» В. Карэтнікава (з сюіты «Поры года»). Назіранне за развіццём музыкі. Выяўленне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора «Снегапад» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Развучванне песні «Снегопад» (муз. Ж. Металідзі, сл. Э. Фарджон, пер. М. Барадзіцкай). Выяўленне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам для развіцця музыкі. Выразнае выкананне песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 89—91 |
| 19 | Развіццё мелодыі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб развіцці мелодыі.<br>*Задачы*:<br>1) паглыбленне ўяўленняў вучняў аб часавым характары музычнага мастацтва;<br>2) фарміраванне ўменняў назіраць за развіццём мелодыі | Развучванне «Песенки солнечных зайчиков» (муз. У. Казеніна, сл. Ф. Лаўбэ).<br>Назіранне за развіццём мелодыі.<br>Выкананне рытмічнага малюнка на шумавых інструментах. Перадача гукавышыннага развіцця мелодыі сродкамі графікі або пластычнага інтанавання. | С. 92—94 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | і адлюстроўваць яго пры дапамозе графічнага, пластычнага і прасторавага мадэлявання;<br>3) развіццё гукавышыннага слыху і пачуцця метрарытму | Выразнае выкананне песні.<br>Слуханне твора «Варона на слізкім даху» Г. Гарэлавай. Назіранне за развіццём музыкі. Вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам. Стварэнне невялікага апавядання на аснове твора (індывідуальна).<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 20 | Дынамічнае развіццё музыкі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб дынамічным развіцці музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб дынамічнай шкале;<br>2) увядзенне паняццяў *крэшчэнда* і *дымінуэнда;*<br>3) фарміраванне ўменняў назіраць за дынамічным развіццём музыкі і адлюстроўваць яго пры дапамозе пластычнага і колеравага мадэлявання;<br>4) развіццё дынамічнага слыху | Выразнае чытанне верша «Была тишина» А. Шыбаева. Выкарыстанне пры чытанні прыёмаў павелічэння і памяншэння сілы гуку.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша «Была тишина» А. Шыбаева (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне твора «Раніца» Э. Грыга (з музыкі да драмы Г. Ібсена «Пэр Гюнт»). Назіранне за дынамічным развіццём музыкі, адлюстраванне дынамічных змяненняў пры дапамозе адценняў колеру.<br>Вольнае дырыжыраванне творам.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 95—97 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 21 | Тэмпавае развіццё музыкі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб тэмпавым развіцці музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб музычных тэмпах;<br>2) фарміраванне ўменняў назіраць за тэмпавым развіццём музыкі і адлюстроўваць яго пры дапамозе пластычнага мадэлявання;<br>3) фарміраванне ўменняў ажыццяўляць развіццё музыкі пры дапамозе паскарэння, запавольвання, кантраснага супастаўлення тэмпаў;<br>4) развіццё пачуцця тэмпарытму | Развучванне папеўкі «Как под мельницей» (муз. М. Андрэевай, сл. народныя). Назіранне за развіццём музыкі.<br>Вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>Выразнае выкананне папеўкі.<br>Слуханне твора «У пячоры горнага караля» Э. Грыга (з музыкі да драмы Г. Ібсена «Пэр Гюнт»). Назіранне за тэмпавым і дынамічным развіццём музыкі.<br>Развучванне песні «Поезд» (муз. М. Мятлова, сл. Т. Сікорскай). Назіранне за тэмпавым развіццём музыкі.<br>Перадача змяненняў тэмпу пры дапамозе руху.<br>Выразнае выкананне песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 98—101 |
| 22 | Тэмбравае і рэгістравае развіццё музыкі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб тэмбравым і рэгістравым развіцці музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб тэмбрах галасоў, тэмбрах і рэгістрах інструментаў;<br>2) фарміраванне ўменняў назіраць за тэмбравым і рэгі- | Слуханне твора «Вясельны дзень у Трольхаўгене» Э. Грыга. Назіранне за рэгістравым развіццём музыкі. Адлюстраванне змен рэгістраў пры дапамозе выразных рухаў рук (на рознай вышыні).<br>Развучванне песні «Медведь и комар» (муз. А. Праслянёва, сл. В. Шуміліна). Назіранне за развіццём музыкі. Выра- | С. 101—104 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | стравым развіццём музыкі і адлюстроўваць яго пры дапамозе колеравага, пластычнага, слоўнага мадэлявання;<br>3) фарміраванне ўменняў ажыццяўляць развіццё музыкі пры дапамозе розных тэмбраў інструментаў;<br>4) развіццё тэмбравага слыху | знае выкананне песні.<br>Слуханне фантазіі на тэму беларускай народнай песні «Перапёлачка» Я. Глебава. Назіранне за тэмбравым развіццём музыкі.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне інструментальнай партытуры на аснове беларускай народнай песні «Перапёлачка». Выкарыстанне тэмбраў розных інструментаў.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 23 | Ладавае развіццё музыкі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб ладавым развіцці музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб ладавай афарбоўцы мелодыі;<br>2) увядзенне паняццяў *мажор*, *мінор*, *дыез*, *бемоль*, *бекар*;<br>3) фарміраванне ўменняў назіраць за ладавым развіццём музыкі і адлюстроўваць яго пры дапамозе колеравага і слоўнага мадэлявання;<br>4) развіццё ладавага пачуцця | Слуханне «Вальса» Ф. Шуберта. Назіранне за развіццём музыкі, фіксацыя змяненняў ладу. Адлюстраванне ладавых змяненняў пры дапамозе картак з каляровай паперы.<br>Развучванне песні «Улитка» (муз. В. Кікты, сл. С. Сяровай). Назіранне за ладавым развіццём музыкі. Перадача ладавых змяненняў у музыцы пры дапамозе колеравага мадэлявання.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша В. Берастава «Тучка» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 105—110 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 24 | Майстэрства выканаўцаў | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб выканальніцкім майстэрстве.<br>*Задачы*:<br>1) фарміраванне ўменняў дыферэнцыраваць кампазітарскія і выканальніцкія сродкі развіцця музыкі;<br>2) фарміраванне ўменняў самастойна адбіраць сродкі развіцця музыкі, ствараць выканальніцкі план твора;<br>3) удасканальванне ўменняў выразнага спявання і інструментальнага музіцыравання;<br>4) развіццё творчых здольнасцей | Развучванне песні «Тень-тень, потетень» (муз. В. Калінніказа, сл. народныя). Складанне выканальніцкага плана.<br>Выразнае выкананне, інсцэніроўка песні.<br>Выразнае чытанне верша А. Дрыза «Как сделать утро волшебным».<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша А. Дрыза «Как сделать утро волшебным» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Развучванне песні «Самая лепшая» (муз. С. Хвашчынскага, сл. У. Карызны). Складанне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 110—116 |
| 25 | Музычныя дыялогі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб музычным дыялогу.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне вучняў з рознымі відамі музычнага дыялогу;<br>2) фарміраванне ўяўленняў аб будове музычнага дыялогу;<br>3) фарміраванне ўменя мадэляваць музычны дыялог; | Развучванне песні «Сороконожки» (муз. А. Даньшовай, сл. У. Арлова).Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне музычнага дыялогу (пытанняў і адказаў). Выразнае выкананне, інсцэніроўка песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне музычнага дыялогу (калектыўна) або яго частак (пытанне, адказ) (індывідуальна).<br>Абмеркаванне атрыманых вынікаў. | С. 116—120 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 4) развіццё творчых здольнасцей | Слуханне беларускай народнай песні «Вясна-красна». Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне музычнага дыялогу. Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 26 | Абагульняючы ўрок па тэме «Развіццё музыкі» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні аб спосабах і сродках развіцця музыкі.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя набытых ведаў, абагульненне вопыту практычнай музычнай дзейнасці;<br>2) апернраванне паняццямі *развіццё музыкі*, *крэшчэнда*, *дымінуэнда*, *мажор*, *мінор*, *дыез*, *бемоль*, *бекар*;<br>3) удасканальванне ўменняў назіраць за развіццём музыкі;<br>4) удасканальванне ўменняў ажыццяўляць развіццё музыкі пры дапамозе кампазітарскіх і выканальніцкіх сродкаў | Выкананне і слуханне музычных твораў на выбар навучэнцаў і настаўніка. Прэзентацыя мастацка-творчых (даследчых) праектаў па тэме «Развіццё музыкі».<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 121 |
| **IV чвэрць<br>Будова (формы) музыкі (9 г)** | | | | | |
| 27 | Разнастайнасць будовы музычных твораў | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб разнастайнасці музычных форм. | Развучванне песні «Прекрасен мир поющий» (муз. Л. Абелян, сл. У. Сцяпанава). Вызначэнне будовы твора. Выра- | С. 122—125 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | *Задачы*:<br>1) актуалізацыя назапашанага навучэнцамі вопыту ўспрымання, выканання і стварэння музыкі;<br>2) фарміраванне ўмення выяўляць узаемасувязь паміж зместам і формай музычнага твора;<br>3) удасканальванне аналітычных уменняў;<br>4) развіццё навыку формаўтварэння | знае выкананне песні.<br>Слуханне і выкананне вывучаных раней музычных твораў, напісаных у кантраснай двухчасткавай, рэпрызнай трохчасткавай формах, форме рондa. Вызначэнне будовы музычных твораў.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 28<br>29 | Кантрасты і паўторы ў жыцці і музыцы | 2 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб сутнасці кантрасту і паўтору ў музыцы.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя паняццяў *кантраст*, *паўтор*;<br>2) дыферэнцыяцыя паняццяў *паўтор*, *падабенства*;<br>3) фарміраванне ўмення адбіраць кантрасныя або падобныя сродкі музычнай выразнасці пры вырашэнні мастацкай задачы | Выразнае чытанне верша Р. Заслаўскага «У Белого моря».<br>Выяўленне кантрастаў, складанне выканальніцкага плана. Перадача кантрастаў сродкамі пластычнага інтанавання, графічнага і слоўнага мадэлявання.<br>Развучванне песні «Цёплыя дзянёчкі» (муз. М. Літвіна, сл. Л. Пранчака). Выяўленне кантрастаў, складанне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>Слуханне беларускага народнага танца «Карагодны» ў апрацоўцы М. Чуркіна. Выяўленне кантрастаў, сродкаў рэгістравага развіцця. | С. 126—133 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Развучванне беларускай народнай песні «А мы грушу пасадзілі» або беларускай народнай песні «Кума мая, кумачка». Назіранне за развіццём музыкі. Выяўленне паўтораў. Выразнае выкананне песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 30 | Як музыка расказвае гісторыі, у якіх няма кантрастаў | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб музычных формах, у якіх няма супастаўлення кантрасных частак.<br>*Задачы:*<br>1) актуалізацыя ўяўленняў аб развіцці музыкі;<br>2) увядзенне паняцця *кульмінацыя*;<br>3) фарміраванне ўменняў назіраць за развіццём музыкі, адлюстроўваць яго рознымі спосабамі;<br>4) развіццё навыку формаўтварэння | «Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша А. Дзеружынскага (с. 135) (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне твора «Вячэрнія аблокі» А. Літвіноўскага. Назіранне за развіццём музыкі. Вызначэнне будовы музычнага твора. Стварэнне ілюстрацыі да музычнага твора.<br>Развучванне песні «Прятки» (муз. А. Думчанкі, сл. А. Кушнера). Назіранне за развіццём музыкі. Вызначэнне будовы музычнага твора. Стварэнне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>Слуханне Прэлюдыі № 7 Ф. Шапэна. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне кульмінацыі. Перадача руху мелодыі пры дапамозе пластычнага інтанавання. | С. 134—139 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 31 | Двухчасткавая форма | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб двухчасткавай форме.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя назапашанага навучэнцамі вопыту ўспрымання, выканання, стварэння музыкі;<br>2) увядзенне паняццяў *куплет*, *запеў*, *прыпеў*;<br>3) фарміраванне ўменняў вызначаць і перадаваць рознымі спосабамі форму музычнага твора;<br>4) фарміраванне ўмення мадэляваць твор у двухчасткавай кантраснай форме | Развучванне песні «Доброта» (муз. І. Лучанка, сл. Н. Тулупавай). Назіранне за развіццём музыкі. Вызначэнне будовы музычнага твора. Адлюстраванне будовы твора пры дапамозе картак з каляровай паперы.<br>Стварэнне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша Д. Хармса «Весёлый старичок» (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне «Італьянскай песенькі» з «Дзіцячага альбома» П. Чайкоўскага. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне будовы твора. Адлюстраванне будовы твора пры дапамозе картак з каляровай паперы.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 139—143 |
| 32 | Трохчасткавая рэпрызная форма | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб трохчасткавай рэпрызнай форме.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя назапаша- | Выразнае чытанне верша І. Такмаковай «Где спит рыбка?».<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша І. Такмаковай «Где спит рыбка?» | С. 144—148 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | нага навучэнцамі вопыту ўспрымання, выканання, стварэння музыкі;<br>2) фарміраванне ўменняў вызначаць і перадаваць living рознымі спосабамі форму музычнага твора;<br>3) фарміраванне ўмення мадэляваць твор у трохчасткавай рэпрызнай форме;<br>4) развіццё навыку формаўтварэння | (калектыўна). Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Развучванне песні «Весёлые медвежатки» (муз. А. Паплянавай, сл. Н. Пікулёвай). Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне будовы музычнага твора. Перадача будовы твора пры дапамозе картак з каляровай паперы. Стварэнне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>Слуханне твора «Баба Яга» з «Дзіцячага альбома» П. Чайкоўскага. Вызначэнне будовы твора, выразных сродкаў, выкарыстаных кампазітарам у кожнай з частак.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 33 | Ронда | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб форме ронда.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя назапашанага навучэнцамі вопыту мастацкай дзейнасці;<br>2) увядзенне паняццяў *рэфрэн*, *эпізод*;<br>3) фарміраванне ўменняў вызначаць і адлюстроўваць рознымі спосабамі форму музычнага твора; | Выразнае чытанне верша А. Барто «Болтунья».<br>Слуханне твора «Болтунья» (муз. С. Пракоф'ева, сл. А. Барто). Назіранне за развіццём музыкі. Вызначэнне будовы музычнага твора. Перадача будовы твора пры дапамозе картак з каляровай паперы.<br>Развучванне песні «Зачем нам выстроили дом?» (муз. Д. Кабалеўскага, сл. В. Віктарава).<br>Вызначэнне будовы музычнага твора. | С. 149—151 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 4) фарміраванне ўмення мадэляваць твор у форме ронда | Адлюстраванне будовы музычнага твора пры дапамозе картак з каляровай паперы. Складанне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 34 | Варыяцыі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленне аб форме варыяцый.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя назапашанага навучэнцамі вопыту мастацкай дзейнасці;<br>2) увядзенне паняццяў *тэма*, *варыяцыя*;<br>3) фарміраванне ўменняў вызначаць і перадаваць рознымі спосабамі форму музычнага твора;<br>4) фарміраванне ўменняў вар'іраваць мелодыю | Развучванне беларускай народнай песні «На лугу, на лугу зелянёшанькім». Складанне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне варыянтаў мелодыі беларускай народнай песні «На лугу, на лугу зелянёшанькім» (індывідуальна). Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Слуханне твора М. Глінкі «Камарынская». Назіранне за змяненнем мелодый.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 151—155 |
| 35 | Абагульняючы ўрок па тэме «Будова (формы) музыкі» | 1 | *Мэта*: абагульненне ўяўленняў навучэнцаў аб будове музычных твораў.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя набытых ведаў і абагульненне вопыту практычнай музычнай дзейнасці; | Выкананне і слуханне твораў на выбар навучэнцаў і настаўніка.<br>Прэзентацыя мастацка-творчых (даследчых) праектаў па тэме «Будова (формы) музыкі».<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 156 |

*Заканчэнне*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
|  |  |  | 2) аперыраванне паняццямі *кантраст*, *рэпрыза*, *куплет*, *запеў*, *прыпеў*, *рэфрэн*, *эпізод*, *тэма*, *варыяцыя*;<br>3) удасканальванне слухацкіх, выканальніцкіх і кампазітарскіх уменняў |  |  |

# 4 КЛАС

35 г

Гуляева, А. Р. Музыка : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : для работы ў кл. / А. Р. Гуляева, С. А. Прастакова, С. М. Кабачэўская. — Мінск : Пачатковая школа, 2018. — 168 с.

| № урока і дата правя-дзення | Тэма ўрока | Коль-касць гадзін | Мэта і задачы ўрока | Асноўныя віды і спосабы дзейнасці | Матэрыял вучэбнага дапаможніка |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **I паўгоддзе<br>Музычная культура Беларусі (16 г)** | | | | | |
| 1 | Музыка — люстэрка жыцця і душа народа | 1 | *Мэта*: сфарміраваць у навучэнцаў уяўленні пра шматмернасць вобраза Радзімы ў беларускай музычнай культуры; узбагаціць вопыт выканання, слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з разнастайнымі бакамі музычнай культуры Беларусі;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) удасканальванне слухацкіх | Выкананне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.<br>Слуханне твора «Радзіма мая дарагая» (муз. У. Алоўнікава, сл. А. Бачылы). Назіранне за развіццём музыкі. Выяўленне зерня-інтанацыі, перадача развіцця мелодыі пры дапамозе пластычнага інтанавання. Вызначэнне асаблівасцей будовы (формы) твора.<br>Развучванне і выразнае выкананне беларускай народнай песні «Пайшоў Ясь наш на лужок».<br>Слуханне фіналу Сімфаньеты «Беларускія карцінкі» М. Чуркіна. Вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэн- | С. 5—18 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | і выканальніцкіх уменняў;<br>4) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | не музычных папевак-прывітанняў. Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Слуханне Вітання Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча (на аснове вясельнай народнай песні «Частуйцеся, госці»). Назіранне за развіццём музыкі. Асэнсаванне беражлівых адносін да народна-песеннай асновы, захавання яе характэрных асаблівасцей пры апрацоўцы народнай песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 2<br>3 | Нараджэнне і жыццё беларускай песні | 2 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра песенную культуру беларускага народа; узбагаціць вопыт выканання, слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з працэсам стварэння і асаблівасцямі існавання народнай песні;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця; | Слуханне (выразнае чытанне) урыўка з нарыса М. Горкага «Как сложили песню». Асэнсаванне працэсу стварэння народнай песні.<br>Слуханне беларускай народнай песні «Чаму ж мне не пець?». Назіранне за развіццём музыкі. Выяўленне жыццёвага зместу і характэрных асаблівасцей песні, яе развучванне і выкананне.<br>Слуханне беларускай народнай песні «Ох, і сеяла Ульяніца лянок». Выяўленне жыццёвага зместу, будовы і характэрных асаблівасцей песні, яе развучванне і выкананне, дапоўненае вы- | С. 18—28 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 3) пашырэнне ўяўленняў пра разнастайнасць беларускіх народных песень, практычнае засваенне характэрных асаблівасцей беларускай народнай песні (распеўнасць, пераменны лад);<br>4) удасканальванне слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | разнымі рухамі.<br>Развучванне беларускай народнай песні «Спі, сыночак міленькі». Вызначэнне жыццёвага зместу, характэрных асаблівасцей песні, яе выразнае выкананне.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: вар'іраванне мелодыі песні «Спі, сыночак міленькі». Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Слуханне «Беларускай калыханкі» М. Чуркіна. Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне народных напеваў, пакладзеных у аснову твора. Стварэнне невялікага апавядання паводле «Беларускай калыханкі».<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 4 | Восеньскія песні | 1 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра восеньскія песні; узбагаціць вопыт выканання, слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў са зместам і выразнымі асаблівасцямі народных песень восеньскага перыяду; | Слуханне беларускай народнай песні «Ой, мамачка, восень». Выяўленне жыццёвага зместу і характэрных асаблівасцей песні.<br>Развучванне і выразнае выкананне беларускай народнай песні «Відзіць маё вочка».<br>Слуханне беларускай народнай песні «Бачыць маё вочка, што край недалёчка».<br>Параўнанне беларускіх народных песень «Відзіць маё вочка» і «Бачыць маё | С. 29—36 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) практычнае засваенне характэрных асаблівасцей беларускай народнай песні (распеўнасць, пераменны лад), увядзенне паняцця *пераменны лад*;<br>4) удасканальванне вакальна-харавых навыкаў, фарміраванне ўмення спяваць без суправаджэння;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць ў творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | вочка, што край недалёчка», выяўленне падабенстваў і адрозненняў.<br>Слуханне твора «Адлятаюць птушкі» В. Карэтнікава (з сюіты «Поры года»). Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора «Восеньскі пейзаж». Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Слуханне песні «Журавінка» (муз. М. Літвіна, сл. І. Цітаўца). Вызначэнне будовы песні, асаблівасцей ладавага развіцця музыкі. Развучванне песні. Складанне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 5 | Музыка ў казках беларускага народа | 1 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра ролю музыкі ў казках беларускага народа; узбагаціць вопыт успрымання, выканання і стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з казкамі беларускага народа | Слуханне (выразнае чытанне) урыўка з беларускай народнай казкі «Музы́ка-чарадзей».<br>Выяўленне казачных фрагментаў, якія «гучаць». Стварэнне літаратурна-музычнай кампазіцыі «Музы́ка-чарадзей» з выкарыстаннем фрагментаў ужо вывучаных музычных твораў. Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Развучванне беларускай народнай песні | С. 36—42 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | пра музы́каў і музычныя інструменты, з музычнымі творамі, напісанымі на казачны сюжэт;<br>2) развіццё ўменняў выяўляць у казках фрагменты, якія «гучаць», выконваць музыку, якая ўвасабляе казачныя вобразы;<br>3) фарміраванне элементарных акцёрскіх і рэжысёрскіх уменняў;<br>4) развіццё асацыятыўна-вобразнага мыслення, фантазіі;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць ў творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | «Як паставіў верабейка на сметнічку хатку». Вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, неабходных для перадачы характару кожнага з персанажаў. Выразнае выкананне, інсцэніроўка песні. Стварэнне ілюстрацыі да песні.<br>Развучванне «Песенькі сяброў» з мюзікла «Прыгоды ў замку Алфавіт» (муз. В. Войціка, сл. С. Клімковіч). Вызначэнне характару музыкі запеву і прыпеву. Выкананне твора, дапоўненае выразнымі рухамі пад музыку.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора паводле любімай беларускай казкі. Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 6 | Музыка ў гульнях беларускага народа | 1 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра ролю музыкі ў гульнях беларускага народа; узбагаціць вопыт удзелу ў гульнях; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з гульнямі беларускага народа; | Паўтарэнне беларускай народнай песні «А мы грушу пасадзілі». Выкананне песні, дапоўненае выразнымі рухамі. Знаёмства з правіламі правядзення беларускай народнай гульні «Грушка», вызначэнне ролі музыкі ў гульні.<br>Развучванне папеўкі «У мядзведзя на бару». Знаёмства з правіламі правядзення беларускай народнай гульні «У мядзведзя на бару», выяўленне ролі музыкі ў ёй. | С. 42—48 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2) выяўленне ролі музыкі ў гульні;<br>3) удасканальванне ўменняў выразна спяваць і рухацца пад музыку;<br>4) развіццё асацыятыўна-вобразнага мыслення, уяўлення і фантазіі;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | «Калі б кампазітарам быў я...»: вар'іраванне, стварэнне новых варыянтаў папеўкі «У мядзведзя на бару». Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Развучванне папеўкі «Журавель». Выкананне папеўкі, дапоўненае выразнымі рухамі. Знаёмства з правіламі правядзення беларускай народнай гульні «Журавель», вызначэнне ролі музыкі ў ёй.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне папевак-лічылак для гульняў «Грушка», «У мядзведзя на бару», «Журавель». Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 7<br>8 | Беларускія музычныя інструменты | 2 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра беларускія народныя інструменты; узбагаціць вопыт выканання, слухання і стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя ўяўленняў пра беларускія народныя ін- | Слуханне найгрышу на дудцы «Восень». Вызначэнне характару музыкі, характарыстыка (словам, колерам) тэмбру інструмента.<br>Слуханне найгрышу на цымбалах «Казачок беларускі». Вызначэнне характару музыкі, характарыстыка (словам, колерам) тэмбру інструмента.<br>Слуханне найгрышу на скрыпцы «Цярэшка». Вызначэнне характару музыкі, характарыстыка (словам, колерам) тэм- | С. 49—56 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | струменты;<br>2) удасканальванне ўменняў назіраць за тэмбравым развіццём музыкі, характарызаваць рознымі спосабамі тэмбры народных інструментаў;<br>3) фарміраванне элементарных уменняў інструментоўкі (з выкарыстаннем знаёмых інструментаў);<br>4) удасканальванне слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць ў творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | бру інструмента.<br>Слуханне найгрышу «Кадрыля» на гармоніку і бубне, найгрышу «Шастак» на скрыпцы, цымбалах, гармоніку і бубне, беларускага народнага танца «Юрачка». Назіранне за тэмбравым развіццём музыкі, вызначэнне па характэрных тэмбрах саставаў ансамбляў народных інструментаў.<br>Слуханне найгрышу на дудзе «Кракавяк». Вызначэнне характару музыкі, характарыстыка (словам, колерам) тэмбру інструмента.<br>Развучванне беларускай народнай песні «Зайграй жа мне, дударочку». Стварэнне выканальніцкага плана песні. Выкананне песні, дапоўненае выразнымі рухамі.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне інструментальнай партытуры на аснове прыпеву беларускай народнай песні «Зайграй жа мне, дударочку». Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 9<br>10 | Танцавальная культура майго народа | 2 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра танцавальную культуру беларускага народа; узбагаціць вопыт | Развучванне беларускіх народных песень-танцаў «Янка-полька», «Юрачка», «Мікіта». Выкананне песень-танцаў, дапоўненае выразнымі рухамі. | С. 57—65 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | выканання, слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) пашырэнне ўяўленняў навучэнцаў пра разнастайнасць беларускіх танцаў;<br>2) выяўленне характэрных асаблівасцей беларускіх народных танцаў;<br>3) удасканальванне слухацкіх і выканальніцкіх уменняў, уменняў выразна рухацца пад музыку;<br>4) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць ў творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | «Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне невялікага твора ў трохчасткавай форме з мелодый беларускіх народных песень-танцаў. Абмеркаванне атрыманых вынікаў, выяўленне найбольш гарманічнага спалучэння музычных фрагментаў.<br>Слуханне беларускай народнай песні-танца «Бульба-полька». Вызначэнне яе жыццёвага зместу і характэрных асаблівасцей, развучванне, выкананне.<br>Слуханне беларускага народнага танца «Крыжачок». Вызначэнне характару музыкі, назіранне за яе развіццём.<br>Слуханне твора «Беларускія танцы» І. Жыновіча. Назіранне за тэмбравым развіццём музыкі, выяўленне беларускіх народных танцаў, пакладзеных у аснову твора. Слуханне твора «Куранта» з Астрамечаўскага рукапісу («Полацкага сшытка»). Вызначэнне характару музыкі, характарыстыка (словам, колерам) тэмбраў інструментаў.<br>«Калі б харэографам быў я...»: апісанне (паказ) рухаў, якія маглі быць выкананы пад музыку твора «Куранта». Абмеркаванне атрыманых вынікаў. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 11<br>12<br>13 | Музыка расказвае пра мінулае нашай Радзімы | 3 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра ролю музыкі ў адлюстраванні гістарычных падзей; узбагаціць вопыт выканання, слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з музычнымі творамі, якія расказваюць пра мінулае нашай Радзімы;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) развіццё слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>4) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць ў творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Слуханне песні «Мірскі замак» (муз. В. Кісценя, сл. І. Цітаўца). Вызначэнне характэрных асаблівасцей песні, яе развучванне і выразнае выкананне.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора, які перадае велічны вобраз Мірскага замка. Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Слуханне фрагмента «Вітаўт-сюіты» В. Кузняцова. Вызначэнне характару музыкі, сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам. Стварэнне ілюстрацыі да твора.<br>Слуханне Паланэза № 1 «Паляванне» М. Радзівіла. Назіранне за развіццём музыкі, знаходжанне выяўленчых інтанацый.<br>Слуханне арыі Агаткі з оперы «Агатка, або Прыезд пана» Я. Д. Голанда. Вызначэнне характару музыкі, сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам. Стварэнне ілюстрацыі да твора.<br>Слуханне Паланэза ля мінор М. К. Агінскага. Вызначэнне жыццёвага зместу і асаблівасцей будовы твора. Вызначэнне | С. 65—84 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>Слуханне Паланэза з оперы «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт» А. Залётнева. Параўнанне Паланэза ля мінор М. К. Агінскага і Паланэза А. Залётнева. Выяўленне падабенства і адрозненняў.<br>Развучванне і выразнае выкананне песні «Поклонитесь, внуки, деду» (муз. І. Лучанка, сл. М. Ясеня).<br>Слуханне Тарантэлы з балета «Альпійская балада» Я. Глебава. Назіранне за развіццём музыкі. Выяўленне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>Слуханне «Лесной песни» (муз. У. Алоўнікава, сл. А. Русака). Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам. Стварэнне ілюстрацыі да твора.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэляў музычных твораў паводле карцін «Мінск 3 ліпеня 1944 года» В. Волкава, «Партызаны» М. Савіцкага, «За родную Беларусь» У. Сухаверхава. Абмеркаванне атрыманых вынікаў. | |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 14<br>15 | Музыка ў народных абрадах і святах (Каляды) | 2 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра беларускую каляндарна-абрадавую традыцыю (зімовы цыкл); паспрыяць авалоданню ўменнямі, неабходнымі для ўдзелу ў правядзенні народных свят.<br>*Задачы*:<br>1) пашырэнне ўяўленняў навучэнцаў пра народнае свята Каляды;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) фарміраванне ўменняў вызначаць каляндарна-абрадавую музыку зімовага цыкла па характэрных прыкметах;<br>4) удасканальванне ўменняў выразнага спявання, руху пад музыку, фарміраванне элементарных акцёрскіх і рэжысёрскіх уменняў;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Слуханне беларускай народнай песні «Го-го-го, каза». Выяўленне жыццёвага зместу і характэрных асаблівасцей песні. Развучванне і выкананне песні, дапоўненае выразнымі рухамі.<br>Слуханне беларускай народнай песні «На нова лета». Выяўленне жыццёвага зместу і характэрных асаблівасцей, развучванне і выразнае выкананне песні.<br>Слуханне фрагмента «Каляднікі» з сюіты «Забавы» В. Войціка. Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам. Стварэнне ілюстрацый да твора.<br>Развучванне песні «Што прыносіць Новы год?» (муз. А. Безенсон, сл. Л. Дайнекі).<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: калектыўнае стварэнне музыкі сярэдняй часткі песні «Што прыносіць Новы год?». Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Выкананне песні, дапоўненае выразнымі рухамі.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 84—91 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 16 | Абагульняючы ўрок па тэме «Музычная культура Беларусі» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні навучэнцаў пра музычную культуру Беларусі; развіць прэзентацыйныя ўменні, музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя набытых ведаў, абагульненне вопыту практычнай музычнай дзейнасці;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) удасканальванне ўменняў слухання і выканання музыкі, элементарных акцёрскіх і рэжысёрскіх уменняў;<br>4) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Слуханне і выкананне музычнага матэрыялу на выбар навучэнцаў і настаўніка.<br>Прэзентацыя творчых (даследчых) праектаў па тэме «Музычная культура Беларусі».<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 92—93 |
| **II паўгоддзе<br>Музычныя падарожжы (19 г)** | | | | | |
| 17 | Музыка — мова дружбы і ўзаемапаразумення паміж народамі | 1 | *Мэта*: сфарміраваць уяўленні пра камунікатыўную прыроду музычнага мастацтва; узбагаціць вопыт выканання, | Слуханне і выкананне музычных і літаратурных твораў, якія раскрываюць тэму сяброўства (на выбар навучэнцаў і настаўніка). | С. 94—99 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) актуалізацыя наяўнага вопыту ўспрымання, выканання і стварэння музыкі;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра тое, што «музыка — мова, якая не патрабуе перакладу»;<br>3) развіццё навыкаў цэласнай музычнай камунікацыі ў адзінстве дзейнасці кампазітара-выканаўцы-слухача;<br>4) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць ва ўласнай мастацкай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Слуханне папеўкі «Дружба». Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне характару музычнай мовы. Развучванне і выразнае выкананне папеўкі.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне рытмічнага акампанементу да папеўкі. Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Слуханне песні «Рамонка» (муз. І. Лучанка, сл. А. Вольскага). Выяўленне ідэі песні, вызначэнне характару музыкі і асаблівасцей будовы твора. Развучванне і выразнае выкананне песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 18<br>19<br>20<br>21 | Музыка нашых суседзяў — рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў | 4 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра характэрныя асаблівасці музыкі рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў; узбагаціць вопыт выканання, слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці. | Слуханне рускай народнай песні «Вниз по матушке по Волге». Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару, сродкаў музычнай выразнасці. Перадача малюнка мелодыі пры дапамозе пластычнага інтанавання або лініі.<br>Слуханне «Песні пра Нёман» (муз. Н. Сакалоўскага, сл. А. Астрэйкі). Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характа- | С. 99—113 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | *Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з музычнымі творамі, якія адлюстроўваюць характэрныя асаблівасці музыкі рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра тое, што «музыка – мова, якая не патрабуе перакладу»;<br>3) развіццё аналітычных уменняў;<br>4) развіццё слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | ру, сродкаў музычнай выразнасці.<br>Параўнанне «Песні пра Нёман» з рускай народнай песняй «Вниз по матушке по Волге». Выяўленне падабенства і адрозненняў.<br>Развучванне песні «Моя Россия» (муз. Г. Струвэ, сл. Н. Салаўёвай). Вызначэнне настрою, перададзенага ў музыцы, сродкаў музычнай выразнасці.<br>Выразнае выкананне песні.<br>Слуханне хору «Слаўся» з оперы «Іван Сусанін» М. Глінкі. Вызначэнне характару музыкі, сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>Слуханне песні «Реве та стогне Дніпр широкий» (муз. народная, сл. Т. Шаўчэнкі). Вызначэнне характару музыкі. Перадача малюнка мелодыі пры дапамозе пластычнага інтанавання або лініі. Параўнанне песні «Реве та стогне Дніпр широкий» з рускай народнай песняй «Вниз по матушке по Волге» і «Песняй пра Нёман», выяўленне падабенства і адрозненняў.<br>Развучванне польскай народнай песні «Вісла» (апрац. У. Іваннікава, пер. С. Кандрацева). Вызначэнне характару музыкі, сродкаў музычнай выразнасці. Параўнанне польскай народнай песні | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | «Вісла» з рускай народнай песняй «Вниз по матушке по Волге» і «Песняй пра Нёман». Выяўленне падабенства і адрозненняў. Выразнае выкананне песні. Слуханне польскага традыцыйнага танца «Мазурка». Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне сінкоп. «Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне рытмічнага акампанементу да мазуркі. Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне літоўскай народнай песні «Солнышко вставало». Вызначэнне характару музыкі, сродкаў музычнай выразнасці. Развучванне песні. Складанне выканальніцкага плана. Выразнае выкананне песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне рытмічнага акампанементу да трэцяга куплета літоўскай народнай песні «Солнышко вставало». Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне фрагмента з сімфанічнай паэмы «У лесе» М. К. Чурлёніса. Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора «Лес». Абмеркаванне атрыманых вынікаў. | |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 22 | Музыка ў народных абрадах і святах (Масленіца, Гуканне вясны, Саракі) | 1 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра беларускую каляндарна-абрадавую традыцыю (вясенні цыкл); узбагаціць уменнямі, неабходнымі для ўдзелу ў народных святах.<br>*Задачы*:<br>1) пашырэнне ўяўленняў навучэнцаў пра народныя святы «Масленіца», «Гуканне вясны», «Саракі»;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) фарміраванне ўмення вызначаць каляндарна-абрадавую музыку вясенняга цыкла па характэрных прыкметах;<br>4) удасканальванне ўменняў выразных спеваў, рухаў пад музыку, фарміравання элементарных акцёрскіх і рэжысёрскіх уменняў;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выка- | Слуханне песні «Мы ідзём гукаць вясну» (муз. В. Сярых, сл. І. Цітаўца). Вызначэнне настрою, перададзенага ў музыцы, будовы (формы) твора, сродкаў музычнай выразнасці. Развучванне і выразнае выкананне песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне падгалоска да мелодыі прыпеву песні «Мы ідзём гукаць вясну». Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне беларускай народнай песні «Жаваронaчкі, прыляціце». Назіранне за развіццём музыкі. Вызначэнне характару музыкі, выяўленне характэрных асаблівасцей (пераменнага ладу, пераменнага памеру). Развучванне і выразнае выкананне песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мадэлі музычнага твора «Гуканне вясны». Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 114—118 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | рыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | | |
| 23<br>24<br>25<br>26 | Музычнае падарожжа па Еўропе | 4 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра характэрныя асаблівасці музыкі народаў Еўропы; узбагаціць вопыт выканання, слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з музычнымі творамі, якія адлюстроўваюць характэрныя асаблівасці музыкі народаў Еўропы;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра тое, што «музыка – мова, якая не патрабуе перакладу»;<br>3) развіццё аналітычных уменняў;<br>4) развіццё слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Слуханне «Неапалітанскай тарантэлы» Дж. Расіні. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару, выяўленне выкарыстаных кампазітарам сродкаў музычнай выразнасці.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне рытмічнага акампанементу да «Неапалітанскай тарантэлы». Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне твора «Кампанела» Н. Паганіні. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам, выразных і выяўленчых інтанацый.<br>Слуханне італьянскай народнай песні «Санта Лючыя». Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару. Перадача малюнка мелодыі пры дапамозе пластычнага інтанавання або лініі.<br>Слуханне хору «Послушай, как звуки хрустально чисты» з оперы «Чароўная флейта» В. А. Моцарта. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару, выяўленне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам, выяўленчых інтанацый. Развучванне і выра- | С. 119–126 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | знае выкананне твора.<br>Слуханне «Ронда ў турэцкім стылі» В. А. Моцарта. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне будовы (формы) твора, выяўленне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам, выразных і выяўленчых інтанацый.<br>Слуханне фрагмента I часткі Сімфоніі № 40 В. А. Моцарта. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару, выяўленне выкарыстаных кампазітарам сродкаў музычнай выразнасці. Перадача настрою, выражанага ў музыцы, пры дапамозе колеру.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 27<br>28 | Дзівосныя інтанацыі ўсходняй музыкі | 2 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра характэрныя асаблівасці музыкі Кітая і Японіі; узбагаціць вопыт выканання, слухання, стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з музычнымі творамі, якія | Слуханне традыцыйнай кітайскай музыкі («Вясновыя навальніцы»). Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне ўласцівых ёй ладавых і тэмбравых асаблівасцей.<br>Слуханне фрагмента «Гарадскі пейзаж» з сюіты «Кітайскія акварэлі» С. Бельцюкова. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам. | С. 126—132 |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | адлюстроўваюць характэрныя асаблівасці музыкі Кітая і Японіі;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра тое, што «музыка — мова, якая не патрабуе перакладу»;<br>3) развіццё слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>4) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Слуханне японскай народнай песні «Сакура». Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне зерня-інтанацыі, вызначэнне ладавых асаблівасцей твора.<br>Слуханне песні «Птицы над взморьем» (муз. Ротара Харады, сл. Тарыякі Кагасімы, пер. А. Філіц). Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару, выяўленне ладавых асаблівасцей. Развучванне і выкананне песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне мелодый на аснове традыцыйнай японскай паэзіі. Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 29<br>30 | Узоры афрыканскіх рытмаў | 2 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра характэрныя асаблівасці музыкі народаў Афрыкі; узбагаціць вопыт выканання, слухання і стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з музычнымі творамі, якія адлюстроўваюць характэрныя | Слуханне фрагмента «Святочных цырыманіяльных танцаў у кенійскай вёсцы». Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне яе характэрных асаблівасцей.<br>Слуханне афрыканскай дзіцячай песні «Ветер лагуны» (пер. У. Сібірскага). Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне яе характэрных асаблівасцей. Развучванне і выразнае выкананне песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне рытмічнага акампанементу да песні | С.133—139 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | асаблівасці музыкі народаў Афрыкі;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра тое, што «музыка — мова, якая не патрабуе перакладу»;<br>3) развіццё слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>4) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | «Ветер лагуны». Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне традыцыйнай афрыканскай песні «Сіяхамба». Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне яе характэрных асаблівасцей.<br>Слуханне песні «Бьют тамтамы» (муз. Г. Струвэ, сл. А. Барто). Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару, выяўленне выкарыстаных кампазітарам сродкаў музычнай выразнасці. Развучванне і выразнае выкананне песні.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 31<br>32 | Музыка Амерыкі | 2 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра музычную культуру Амерыкі; узбагаціць вопыт выканання, слухання і стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з музычнымі творамі, якія адлюстроўваюць характэрныя асаблівасці музычнай культуры Амерыкі; | Слуханне спірычуэла «Глыбокая рака». Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару, выяўленне асаблівасцей метрарытму.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне рытмічнага акампанементу да спірычуэла «Глыбокая рака». Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Слуханне традыцыйнага амерыканскага блюза. Вызначэнне характару музыкі, выяўленне сродкаў музычнай выразнасці. Перадача настрою, увасобленага ў музыцы, пры дапамозе колеру. | С.140—146 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2) замацаванне ўяўленняў пра тое, што «музыка — мова, якая не патрабуе перакладу»;<br>3) развіццё слухацкіх і выканальніцкіх уменняў;<br>4) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | Слуханне ўрыўка з «Рапсодыі ў блюзавых тонах» Дж. Гершвіна. Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных кампазітарам.<br>Слуханне «Калыханкі Клары» з оперы «Поргі і Бэс» Дж. Гершвіна. Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне асаблівасцей метрарытму і будовы мелодыі.<br>Слуханне песні «Джаз» (муз. Я. Дубравіна, сл. В. Суслава). Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне яе ладавых і метрарытмічных асаблівасцей.<br>Развучванне і выразнае выкананне песні.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне рытмічнага акампанементу да песні «Джаз». Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 33 | Музыка народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь | 1 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра шматмернасць музычнай культуры Беларусі; узбагаціць вопыт выканання, слухання і стварэння музыкі; развіць музычныя здольнасці і здольнасці да творчасці. | *Рамачны змест (творы для слухання і выканання адбіраюцца настаўнікам самастойна).*<br>Слуханне і выкананне музычнага матэрыялу, што характарызуе музыку народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь. Выяўленне жыццёвага зместу і асаблівасцей існавання музыкі народаў, | С. 146—149 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | *Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з музычнымі творамі, што адлюстроўваюць характэрныя асаблівасці музыкі народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) пашырэнне ўяўленняў пра ўзаемадзеянне і ўзаемапранікненне музычных культур;<br>4) фарміраванне ўмення вылучаць характэрныя асаблівасці музыкі народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | якія насяляюць Рэспубліку Беларусь. Вызначэнне спецыфікі сродкаў музычнай выразнасці і выканальніцкай манеры.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне сюіты «Карагод дружбы» з твораў, што характарызуюць музычную культуру народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь. Абмеркаванне атрыманага выніку.<br>Падрыхтоўка і прэзентацыя творчага (даследчага) праекта пра Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 34 | Музыка ў народных абрадах і святах (Купалле) | 1 | *Мэта*: пашырыць уяўленні навучэнцаў пра беларускую каляндарна-абрадавую традыцыю (летні цыкл); узбагаціць | Слуханне песні «Купалінка» (муз. У. Тэраўскага, сл. М. Чарота). Вызначэнне настрою, уласцівага музыцы, сродкаў музычнай выразнасці. Развучванне | С. 150—153 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | іх уменнямі, неабходнымі для ўдзелу ў народных святах.<br>*Задачы*:<br>1) азнаямленне навучэнцаў з народным святам «Купалле»;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) фарміраванне ўмення вызначаць каляндарна-абрадавую музыку летняга цыкла паводле характэрных прыкмет;<br>4) удасканальванне ўменняў выразных спеваў, руху пад музыку, фарміраванне элементарных акцёрскіх і рэжысёрскіх уменняў;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | і выразнае выкананне песні.<br>Слуханне беларускай народнай песні «Ой, рана на Йвана». Назіранне за развіццём музыкі, выяўленне характэрных асаблівасцей выканання.<br>Слуханне беларускай народнай песні «Сёння Купала, а заўтра Ян». Назіранне за развіццём музыкі, вызначэнне яе характару, выяўленне сродкаў музычнай выразнасці.<br>«Калі б кампазітарам быў я...»: стварэнне кампазіцыі з вядомых купальскіх песень у трохчасткавай форме. Абмеркаванне атрыманых вынікаў.<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | |
| 35 | Абагульняючы ўрок па тэме «Музычныя падарожжы» | 1 | *Мэта*: абагульніць уяўленні навучэнцаў пра камунікатыўную прыроду музычнага мастацтва; пашырыць вопыт слухання, выканання і стварэння музыкі; развіць прэзентацыйныя ўменні, музычныя | Слуханне і выкананне твораў на выбар навучэнцаў і настаўніка.<br>Прэзентацыя творчых (даследчых) праектаў па тэме «Музычныя падарожжы».<br>Ацэнка (самаацэнка, узаемаацэнка) вынікаў вучэбнай дзейнасці | С. 154—155 |

*Заканчэнне*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | здольнасці і здольнасці да творчасці.<br>*Задачы*:<br>1) сістэматызацыя набытых ведаў, абагульненне вопыту практычнай музычнай дзейнасці;<br>2) замацаванне ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі і жыцця;<br>3) замацаванне ўяўленняў пра тое, што «музыка — мова, якая не патрабуе перакладу»;<br>4) удасканальванне ўменняў выразных спеваў, руху пад музыку, інструментальнага музіцыравання, элементарных акцёрскіх і рэжысёрскіх уменняў;<br>5) удасканальванне ўменняў самастойна адбіраць і выкарыстоўваць у творчай дзейнасці сродкі музычнай выразнасці | | |

# Змест

*Прадмова* .......... 3
1 клас .......... 4
2 клас .......... 20
3 клас .......... 42
4 клас .......... 66

УДК 373.3.091.214:78
ББК 74.268.53

**Аўтары:**
А. Р. Гуляева, В. В. Каваліў, М. Б. Гарбунова

*Вучэбнае электроннае выданне*

Дата размяшчэння 27.05.2022. Аб'ём 0,5 Мб.

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск.

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
Вул. М. Олешава, 1, офіс 309, 220090, г. Мінск.
**E-mail: info@aversev.by; www.aversev.by**
Кантактныя тэлефоны: (017) 378-00-00, 379-00-00.
Для пісьмаў: а/с 3, 220090, г. Мінск.

**ISBN 978-985-893-107-0 (НІА)**
**ISBN 978-985-19-6514-0 (Аверсэв)**

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2022
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2022